Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. СУБОТА № 195 (30075)

У РАБОТНІКАЎ КУЛЬТУРЫ — СВЯТА 8

ЧЫМ КАРЫСНАЯ І ШКОДНАЯ БУЛЬБА 11

## КАРОТКА

**• У Беларусі намалочана больш за 8,1 млн тон збожжа з улікам рапсу.**

• Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі 7—8 кастрычніка з-за моцнага ветру.

**• Фізасобы ў Беларусі ў верасні прадалі на $76,2 млн валюты больш, чым купілі.**

• Беларускі пачалі практычныя заняткі ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў.

**• У Мінскай вобласці з пачатку года распрацаваны і рэканструяваны 54 экскурсійныя маршруты.**

• Беларусь мае намер узяць удзел у канферэнцыі ў Дубаі аб змяненні клімату.

**• Больш за 100 выпадкаў клешчавога энцэфаліту і барэліёзу зарэгістравана ў Гродзенскай вобласці за верасень.**

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Павел ШКУРКО, начальнік аддзела энергетыкі і газазабеспячэння вытворча-тэхнічнага ўпраўлення Мінэнерга:**

*«Першы энергаблок Беларускай АЭС ужо функцыянуе, а другі блок знаходзіцца ў даследна-прамысловай эксплуатацыі. Два блокі, пачаўшы працаваць у базавым рэжыме, змогуць вырабіць 18,5 млрд кВт гадз. электраэнергіі і замясціць пры гэтым 4,5 млрд куб. м газу. Гэта павышэнне энергетычнай бяспекі дзяржавы ў частцы дывэрсіфікацыі паліўнага складніка. Калі раней можна было казаць пра перспектывы развіцця атамнай энергетыкі ў Беларусі, то цяпер гэта ўжо рэальнасць».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «БУДЗЕМ ЗАГАДЗЯ РЫХТАВАЦЦА ДА АБАРОНЫ СВАЁЙ РАДЗІМЫ НА НАПРАМКАХ ВЕРАГОДНЫХ АТАК НА НАШУ ДЗЯРЖАВУ»

## Падрабязнасці рабочай паездкі Прэзідэнта ў Брэсцкую вобласць

**Пятніцу Першы правёў у першым рэгіёне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць наведаў навучальны аб'ект Міністэрства абароны «Вузел супраціўлення». Кіраўніку дзяржавы паказалі варыянты інжынернага абсталявання вузла супраціўлення Кобрынскага ўмацаванага раёна і яго магчымасці.**

Фота Белта.

### Для чаго патрэбны ўмацаваныя раёны

Міністр абароны ў сваім дакладзе заўважыў, што ў Беларусі ёсць вялікі гістарычны досвед будавання ўмацаваных раёнаў. Іх узводзілі спачатку ў 1930-я гады, затым у 1940—1941 гадах перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Але пры іх стварэнні не былі ўлічаны шматлікія важныя аспекты. На жаль, у 1941 годзе яны сваю ролю не выканалі. Гэты вопыт, як і вопыт сучасных баявых дзеянняў, быў улічаны пры стварэнні ўмацаваных раёнаў цяпер.

Як падкрэсліў у сваім дакладзе камандуючы войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Уладзімір Белы, ваенна-палітычная абстаноўка вакол Беларусі застаецца напружанай. Па яго словах, гэта сведчыць аб тым, што прымяненне ваеннай сілы па-ранейшаму з'яўляецца адным з асноўных інструментаў, якім карыстаюцца для дасягнення палітычных і эканамічных мэт. Уладзімір Белы адзначыў: падзеі ва Украіне паказваюць, што на напрамках, дзе загадзя абсталяваны вузлы супраціўлення, абарона найбольш устойлівая перад наступальнымі сіламі праціўніка.

«Адным з фактараў забеспячэння надзейнай абароны з'яўляецца стварэнне ўмацаваных раёнаў. Іх асноўнае прызначэнне — прыкрыццё найбольш важных у аператыўна-тактычных адносінах раёнаў і верагодных напрамкаў дзеянняў праціўніка з мэтай адбіцця наступлення пераважальных сіл праціўніка і стварэння ўмоў для дзеянняў нашых войскаў», — падкрэсліў Уладзімір Белы.

Прэзідэнту паказалі месцы размяшчэння асабовага складу, камандна-назіральны пункт камандзіра роты, гаспадарчы блок. Знаёмячыся з пазіцыямі мотастралковага аддзялення, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ніякай паказухі быць не павінна. «Нават калі перакананыя, што ні з кім ваяваць не будзем, за паказуху, як за дзедаўшчыну, жалезабетонна спытаем», — папярэдзіў ён. Як далажылі Галоўнакамандуючаму, на базе вузлоў супраціўлення для мотастралковых рот будуць арганізаваны двухтыднёвыя заняткі.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў наяўныя на ўзбраенні і перспектыўныя сродкі для вядзення контрбатарэйнай барацьбы, сродкі сувязі. «Контрбатарэйная барацьба — пытанне пытанняў. Таму, выходзячы з вайны ва Украіне, калі мы бачым, што чагосьці не хапае, вы павінны дакладна сказаць, што нам трэба гэта, гэта, гэта. Таму што без умення весці контрбатарэйную барацьбу на сучаснай вайне ваяваць немагчыма», — адзначыў Галоўнакамандуючы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў асаблівую ролю беспілотнікаў рознага тыпу пры вядзенні баявых дзеянняў і неабходнасць абавязковага аснашчэння падраздзяленняў сучаснымі сродкамі сувязі. Прэзідэнту таксама паказалі комплексныя заняткі з узмоцненай мотастралковай ротай з выкарыстаннем элементаў вузла супраціўлення.

* * *

***Размова Прэзідэнта з журналістамі падчас наведвання ваеннага аб'екта доўжылася больш за гадзіну. Кіраўнік краіны, як заўсёды, трапна і шчыра даў ацэнку сучаснаму парадку дня, у якім бяспека займае адно з самых важных месцаў.***

### У нас ёсць магчымасць нанесці праціўніку непрымальны ўрон

Прэзідэнт адзначыў, што ў краіне будзе нямала такіх пунктаў, як той, які пабачылі. «Мы ў мірны час адпрацуем усе мерапрыемствы для таго, каб загадзя ў выпадку атрымання сігналу аб тым, што суседзі нашы дрэнна сябе паводзяць, заняць гэтыя пункты», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, гэтыя вузлы ўмацавання павінны быць як мінімум цяжка праходнымі для праціўніка. «Будзем загадзя рыхтавацца да абароны сваёй Радзімы на напрамках верагодных атак на нашу дзяржаву», — сказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, падобныя лініі абароны арганізаваны з улікам сучасных войн, у тым ліку ва Украіне, і рэкамендацый ПВК «Вагнер».

Сувязь, разведка, беспілотнікі, ударныя беспілотнікі ў тым ліку, і актыўная абарона — усё гэта, па словах Галоўнакамандуючага, абарона нашай дзяржавы. «Мы не нарошчваем Узброеныя Сілы каля граніц Польшчы і краін Балтыі, каб іх атакаваць. Але, абараняючыся, мы гэта будзем рабіць актыўна, каб у любы момант перайсці ў наступленне, калі для гэтага будзе неабходнасць», — сказаў ён. Пры гэтым, як заўважыў Прэзідэнт, гаворка не ідзе пра больш магутную зброю. «Мы не будзем купляць тысячы танкаў. Але ў нас ёсць магчымасць, як заўсёды, нанесці праціўніку непрымальны ўрон. І перш чым нападаць на Беларусь, ён падумае, што адказ будзе такі, які для іх непрымальны. Вось трэніруемся. Нічога надзвычайнага тут няма», — адзначыў ён.

СТАР. 2

Кропка на карце

# Званы ад маршала Жукава

## Як жыве вёска Амелянец, галоўнай славутасцю якой на працягу стагоддзяў з'яўляецца храм у гонар Уздзвіжання Крыжа Гасподняга

**У адзін з прыгожых кастрычніцкіх па-летняму цёплых дзён гэты храм з пяццю купаламі выглядаў асабліва прывабна-ўрачыста. Яго відаць здалёк, калі толькі ўязджаеш у Амелянец з боку Вярховіч, бо стаіць ён на невялікім узвышшы. Добраўпарадкаваная пляцоўка, высаджаныя кветкі і дэкаратыўныя дрэўцы сведчаць пра клопат настаяцеля і прыхаджан-актывістаў. З апошнімі вясковай святыні дакладна пашанцавала.**

СТАР. 5

# «БУДЗЕМ ЗАГАДЗЯ РЫХТАВАЦЦА ДА АБАРОНЫ НА НАПРАМКАХ ВЕРАГОДНЫХ АТАК

### «Вайну ва Украіне трэба спыніць. Бо будзе горш»

Журналісты звярнулі ўвагу, што ў нядаўна прадстаўленым ваенным бюджэце ЗША не знайшлося месца для ваеннай дапамогі Украіне. Яны пацікавіліся меркаваннем Аляксандра Лукашэнкі, які гэта можа быць сігнал для Кіева. Па словах Прэзідэнта, сэнс гэтага сігналу: «Хлопцы, хутчэй і маштабней наступайце і пабольш туды моладзі кідайце».

«Гэта ўжо не сігнал, гэта ўжо канкрэтнае дзеянне: «забівайце больш украінцаў», — падкрэсліў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, украінскія ўзброеныя сілы ўвязлі ў сваім контрнаступленні. «Рух ёсць туды-сюды. За высоткі ваююць. Бывае, што ўкраінцы гэтыя вышыні захопліваюць з раніцы, да вечара іх расіяне выбіваюць. Таму вельмі складана гэты «контрнаступ» ажыццяўляўся. Першы этап праваліўся, цяпер яны рыхтуюць другі этап (пазначылі 4—8 тыдняў)», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што амерыканцы прыспешваюць украінцаў, бо ўладам ЗША гэтая вайна аўтарытэту не дае. «Тут трэба нейкая перамога. Трэба амерыканцам нешта пакласці на стол, каб выйграць. Таму прыспешваюць. Шукаюць новыя варыянты, аж да спынення падтрымкі Уладзіміра Зяленскага», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Уладзімір Зяленскі ў сваіх адносінах з заходнімі краінамі паводзіць сябе абсалютна правільна, просячы ў іх дапамогі. Прэзідэнт нагадаў, што баявыя дзеянні рыхтаваліся не адзін год, ЗША вызначылі Украіну ахвярай, паабяцаўшы ёй максімальную падтрымку фінансамі і тэхнікай. «Зяленскі паступіў няправільна, калі пагадзіўся. Ён да апошняга ўкраінца ваюе, а яны тое, што абяцалі, ці несвоечасова робяць, ці не даюць тое, што абяцалі. Ці даюць старызну, гэта натуральна, трэба ж утылізаваць усё гэта. Зяленскі задае пытанне: «Як жа так?» І захад (еўрапейцы і асабліва амерыканцы — гэты калектыўны захад) не выконвае дамоўленасці, якія даў Зяленскаму. А ён едзе і ад іх патрабуе. Правільна ён робіць? Правільна», — выказаўся Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым, як заўважыў беларускі лідар, Уладзімір Зяленскі разумее, што заходняя партнёры яго кінулі.

Па словах Прэзідэнта, як бы Еўропа і Амерыка ні дэманстравалі, што яны адзіныя, ніякага адзінства няма. «Еўропа ваяваць не хоча. Еўропа не хоча, каб гэты канфлікт разрастаўся.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Фота Бел ТА.

Амерыканцы далёка, яны думаюць, што адседзяцца за Атлантыкай», — сказаў ён.

Пры гэтым, як заўважыў Прэзідэнт, ЗША пастаўляюць ва Украіну старую тэхніку, якую трэба ўтылізаваць, і выкарыстоўваюць гэту краіну як палігон. «Тое, што ЗША трэба там выпрабаваць, яны выпрабоўваюць. І нават вар'яты-еўрапейцы гавораць аб тым, што гэта самая танная вайна», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ва Украіне ўжо больш за паўмільёна загінулых, моладзь збегла, каб не ваяваць.

«Чарговы раз кажу: трэба спыніцца, бо будзе горш. Ужо палякі гатовы прыхапіць захад Украіны. Расіяне ўжо па ўсіх напрамках вядуць актыўную абарону. Яны ўжо атакуюць. Украінцам ваяваць няма чым. А нават калі ёсць, яны не могуць гэтую сілу стрымліваць. Таму зараз трэба спыніцца, у адваротным выпадку ніхто на гэту тэму размаўляць не будзе, ні з украінцамі, ні з захадам», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

### «Зноў, дурні, думаюць, што за акіянам адсядзяцца»

Прадстаўнікі СМІ звярнулі ўвагу, што ў інтэрнэце актыўна распаўсюджваецца відэа з «Абрамсамі» ў Клайпедзе. «На ваш погляд, да чаго рыхтуюцца нашы суседзі?» — спыталі журналісты.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў яго складваецца ўражанне, што амерыканцы штурхаюць Расію да прымянення самай страшнай зброі. «Гэта ўзбройванне Уладзіміра Зяленскага і яго арміі, аснашчэнне ракетамі далёкага радыуса дзеяння. Няхай нават на глыбіню 300 кіламетраў. Вы ўяляеце: на глыбіню 300 кіламетраў магутныя ракеты будуць цэліць у расійскую тэрыторыю. Вы што, думаеце, Прэзідэнт Расіі і ваенныя будуць на гэта спакойна глядзець?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. Па яго словах, гэта эскалацыя прывядзе да таго, што расіяне дастануць «чырвоную кнопку». «А яшчэ адна такая атака на глыбіню — і адказ будзе каласальным. Інакш навошта такая зброя?» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што амерыканцы штурхаюць еўрапейцаў у гэты бок і адначасова штурхаюць расіян да прымянення крайняй зброі. Вось у чым небяспека. «Зноў, дурні, думаюць, што за акіянам адсядзяцца. Яны ўцягнуць увесь свет у гэтую цяжкую вайну, — канстатаваў ён. — А тое, што яны танкі там выгружаюць, іх жа трэба недзе выгружаць. А літоўцы ж павінны разумець, што яны ад гэтага нічога не атрымаюць. Яны (амерыканцы. — **«Зв.»**) іх проста выкарыстоўваюць. Мы гэта ўсё бачым. І спакойна рыхтуемся да таго, каб працаваць супраць гэтых танкаў. Мы проста рыхтуемся, для таго, каб быць гатовымі адбіць любыя спробы нападзення на нашу тэрыторыю».

### Халуі на шворцы ў Вашынгтона

Падчас размовы Прэзідэнта з журналістамі ўздымаліся не толькі ваенныя, але і грамадска-палітычныя тэмы, пытанні адносінаў з суседзямі. Прадстаўнікоў СМІ цікавіла, ці могуць вынікі парламенцкіх выбараў у Польшчы змяніць рыторыку ў адносінах Мінска і Варшавы.

Аляксандр Лукашэнка адказаў, што зараз немагчыма сказаць, якую палітыку ў адносінах да Беларусі і Расіі будуць праводзіць пераможцы выбараў у Польшчы. «Надзея заўсёды ёсць. Гэтыя зразумела, як сябе паводзяць і будуць паводзіць, а як будуць паводзіць тыя — надзея нейкая ёсць, што яны ўсё ж такі галаву ў рукі возьмуць і будуць працаваць на тое, каб наладзіць адносіны. Дарэчы, такой пазіцыі прытрымліваюцца і дыпламаты Польшчы, і ў тым ліку якія працуюць у нас. Яны, трэба аддаць ім належнае, малайцы, разумеюць, што адбываецца. Але таксама — рукі апусцілі, чакаюць выбараў і кажуць: «Калі новыя сілы прыйдуць да ўлады, то ёсць надзея, што будзе нейкая перазагрузка». На гэта можна спадзявацца. Але вы ж бачыце: мы ні на што не спадзяёмся, мы па максімуме рыхтуемся да горшага варыянта. Рыхтуйся да горшага, будзе лепшае — добра», — адзначыў ён.

У працяг тэмы беларускі лідар раскрыў інсайт. Ён расказаў, чым адрозніваюцца кіруючая ў Польшчы партыя «Права і справядлівасць» (ПіС) і іх апаненты партыя «Грамадзянская платформа» Дональда Туска. «Дональд Туск — гэта праеўрапейскі палітык. «Апісаная» гэта ПіС, Дуда, Маравецкі — халуі Вашынгтона, якія загразлі па вушы і на шворцы знаходзяцца ў Вашынгтона», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў, што еўрапейцам вайна не патрэбна. Таму ёсць надзея, што Дональд Туск, будучы праеўрапейскім палітыкам, будзе дзейнічаць у інтарэсах Еўропы. «А гэтыя — зразумела. Яны хочуць быць калі не пупам, то хаця б пупком усёй планеты. Яны ўзбройваюцца, яны ўжо ўсіх напружылі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што цяпер у польскіх улад назіраюцца напружныя адносіны з іншымі еўрапейскімі дзяржавамі.

«Гэтыя Дуды-Маравецкія ўжо прама заяўляюць, што яны зменяць свет — цытата. Слухайце, яны зменяць свет. Гэта поўнасцю падкантрольныя, на шворцы халуі Вашынтона, сённяшнія ўлады Польшчы. Яны пагразлі ў гэтым, шляху назад няма. Хаця, я іх ведаю даўно, яны могуць развярнуцца. Але амерыканцы не дурні, яны іх павязалі намертва. Таму палітыка іх для нас зразумелая. Гэта будзе праамерыканская палітыка. Варшава будзе апорай ЗША», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Цяперашнія рознагалоссі паміж Польшчай і Украінай ён назваў правалам Варшавы. Па яго словах, адзіны выхад для польскіх улад — «зашыць рот і маўчаць». Але перад выбарамі гэта немагчыма, у электаральную кампанію трэба нешта рабіць. І, як заўважыў беларускі лідар, палякі робяць памылку за памылкай, але ўсё роўна лічаць, што Амерыка ім усё дасць. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, для польскіх улад вялікая рызыка рухацца ў адным напрамку, бо і ў ЗША са зменай кіраўніцтва можа змяніцца пазіцыя.

Беларускі лідар заўважыў: малаверагодна, што Дональд Туск кардынальна зменіць знешнюю палітыку Польшчы. «Туск не будзе за Еўропу і супраць Амерыкі. Але, прынамсі, думаю, што бегчы, як гэта робяць гэтыя апісаныя пісаўцы, за амерыканцамі ён не будзе. Не будзе. Гэта ўсё ж такі еўрапейскі чалавек», — заявіў ён.

### «Мы не хочам, каб палякі лічылі нас чужымі людзьмі»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што неаднаразова казаў, што ён катэгарычна падтрымлівае існаванне Еўрапейскага саюза. Па яго словах, гэта адна з апор існавання нашай планеты. «Калі рухне Еўрапейскі саюз — будзе горача ўсім, — падкрэсліў ён. — Але вельмі спадзяюся, нутром чую, што Германія і ў цэлым Еўропа, Францыя таксама паварочваюцца ў наш бок. Калі будзе новая ўлада ў Польшчы (думаю, што яны не дурні, з боку паназіралі), яны ў гэтым кірунку разварот зробяць. А ўсё астатняе — гэта балбатня. Яны ж ужо кажуць: «Не было б Лукашэнкі, нам трэба было б яго прыдумаць». Аказваецца, Лукашэнка стаў у іх адным з камянёў спатыкнення, спрэчак, пунктаў перасячэння ў іх унутрыпалітычнай барацьбе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што праблемы ў адносінах Беларусі і Польшчы кіраўніцтва суседняй краіны выкарыстоўвае ў сваіх палітычных мэтах. Самы яркі прыклад — міграцыйны крызіс. Ён нагадаў, што палякі нядрэнна зараблялі на міграцыйных патоках. «Па міграцыі якія да нас пытанні? Мы свята захоўвалі тут пазіцыю, не пускаючы мігрантаў. Але яны адмовіліся працаваць з намі па міграцыі», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым з мігрантамі польскі бок паступае самым бязлітасным чынам. «Яны ж забіваюць іх і выкідваюць на нашу тэрыторыю. Вось такая ў іх «дзярмократыя», — канстатаваў беларускі лідар.

Па словах кіраўніка дзяржавы, вакханалія вакол выбараў у Польшчы натуральная. Хто прыйдзе там да ўлады — залежыць ад польскага народа. Аляксандр Лукашэнка расказаў, у чым адзінае ўмяшанне Беларусі ў выбары ў Польшчы: «Мы не хочам, каб палякі лічылі нас чужымі людзьмі, ворагамі. Мы гэтага не хочам. Ніколі не ставілі сваёй мэтай абвастраць з імі адносіны. Нам гэта не патрэбна». Ён падкрэсліў, што ў Беларусі жыве шмат палякаў, якія добра сябе адчуваюць у нашай краіне. «Я абсалютна інтэрнацыянальны чалавек. І я не хачу, каб палякі думалі: «Вось Лукашэнка вораг Польшчы». А яны ж (польскія ўлады. — **«Зв.»**) так гэта даносяць. «А Лукашэнка — Прэзідэнт Беларусі, значыць, і беларусы такія». Я вось гэтага не хачу. І ў гэтым маё ўмяшанне ў выбары ў Польшчы, калі гэта можна назваць умяшаннем», — заявіў беларускі лідар. Ён таксама звярнуў увагу, што Беларусь цалкам адкрытая для палякаў і іншых еўрапейцаў краіна. Аляксандр Лукашэнка назваў «глупствам несусветным» фэйкі аб тым, што ў Беларусі службы бяспекі вярбуюць палякаў, літоўцаў і латышоў. Прычым самі людзі, якія прыязджаюць у Беларусь па бязвізе, кажуць, што ніякай вярбоўкі ў Беларусі і блізка няма. Па словах беларускага лідара, еўрапейскія палітыкі ўжо не могуць прыдумаць нічога істотнага, каб стрымліваць людзей, якія хочуць прыехаць у Беларусь і прыязджаюць.

«Не хачу, каб палякі думалі, што тут жывуць іх ворагі. Мы былі для іх добрымі суседзямі і будзем. А гэтыя Дуды-Маравецкія — людзі часовыя», — падсумаваў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ўсе палітыкі прыходзяць і сыходзяць, і галоўнае ў гісторыі — варты след пакінуць.

### «Няхай нават не разлічваюць разгайдаць Беларусь»

Большую актуальнасць для беларусаў мае свая электаральная кампанія, якая пачынаецца ў Беларусі літаральна праз некалькі месяцаў. Журналісты пацікавіліся, што думае Прэзідэнт наконт заяў аб нібыта прадвызначанасці вынікаў выбараў.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што дзяржава не ўтойвае свайго намеру ўплываць на выбарчы працэс. Але толькі ў той частцы, якая датычыцца работы з людзьмі, растлумачэння выбаршчыкам, чаго на самай справе варты той ці іншы кандыдат, «каб ніякія мярзотнікі не змаглі скарыстацца сітуацыяй». Акрамя таго, мясцовыя органы ўлады так ці інакш будуць задзейнічаны ў арганізацыі выбарчага працэсу, бо ЦВК не валодае дастаткавай штатнай колькасцю супрацоўнікаў для гэтага. Па словах кіраўніка дзяржавы, усе разумеюць, што ўлада ёсць улада

# СВАЁЙ РАДЗІМЫ НА НАШУ ДЗЯРЖАВУ»

і ўдзельнічаць у выбарчым працэсе будзе.

Прэзідэнт выключыў якія-небудзь спробы націску на выбаршчыкаў: «Людзей трэба прасіць, ім трэба расказваць. І ў гэтым заключаецца роля кіраўнікоў палат парламента, губернатараў, усёй вертыкалі ўлады — данесці праўду да людзей».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць забеспячэння пераемнасці ў парламенце. «Нам вопыт патрэбны. Нельга, каб усіх змялі, прыйшлі новыя і год-паўтара (я ж працаваў у парламенце) не будуць ведаць, у якія дзверы зайсці», — сказаў Прэзідэнт. Таму, па яго словах, у парламенце пасля выбараў павінна застацца 25—30 працэнтаў людзей, якія ўжо маюць досвед гэтай работы.

Журналісты пацікавіліся, ці ёсць верагоднасць таго, што пры ўмяшанні краін Захаду на выбарах паўторацца падзеі 2020 года. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што паўтарэнне тых падзей немагчыма. Па яго словах, у Беларусі ўжо не вераць у добрыя намеры калектыўнага Захаду. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 2020 годзе за праведзеныя дэмакратычныя выбары — на Захадзе ніхто «дзякуй» не сказаў. «Цяпер мы з імі гульні на полі дэмакратыі ладзіць не будзем. Мы будзем падыходзіць выключна са сваіх пазіцый. Таму што мы ўбачылі, што гэта за «дэмакратыя», — заўважыў ён. Акрамя таго, вопыт, атрыманы падчас электаральнай кампаніі 2020 года, будзе ўлічаны і пры гэтай выбарчай кампаніі.

«Няхай нават не разлічваюць разгайдаць Беларусь. Мы гэтага не дазволім. У тым ліку і таму, што ёсць вы, і за вас я нясу персанальную адказнасць. Я маю на ўвазе — прыхільнікі, якія зрабілі стаўку на Прэзідэнта, у тым ліку і сілавікі. Я за вас адказваю, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — І я, і ўсе мы нікому не дазволім краіну разгайдаць. Гэта наша краіна. Тыя, хто разгойдвае, ведаюць, да чаго гэта прывядзе».

## Кантроль за падтрымкай шматдзетных сем'яў і фонд Першага

Не абышлося і без вострых сацыяльных тэм. На гэтым тыдні ў судзе пачаўся разгляд рэзанансной крымінальнай справы — бацькоў абвінавачваюць у жорсткім забойстве іх трохгадовага сына. Хлопчык амаль з нараджэння падвяргаўся насіллю з боку бацькоў, галадаў. Асацыяльная сям'я была шматдзетнай, але дзеці гэтым бацькам былі патрэбныя толькі дзеля адпаведных выплат. У студзені 2023 года ў прысутнасці іншых дзяцей муж і жонка нанеслі мноства ўдараў трохгадоваму хлопчыку, ад чаго ён памёр. Журналісты пацікавіліся ў Прэзідэнта, як кантраляваць, на што шматдзетныя бацькі трацяць грошы і ці сапраўды яны заўсёды ідуць на патрэбы дзяцей.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што пра гэтую сітуацыю, безумоўна, ведалі і ўрачы, і суседзі і навакольныя. Але прынцып «мая хата з краю» прывёў да трагедыі. Таму, па словах Прэзідэнта, вельмі важная роля грамадства, якое не павінна быць абыякавым да таго, што адбываецца вакол, і своечасова рэагаваць, прымаць меры. Ён падкрэсліў, што дзяржава будзе падтрымліваць шматдзетныя сем'і, бо неабходна паляпшаць дэмаграфічную сітуацыю ў краіне. Але трэба выбудаваць сістэму такім чынам, каб дапамога была адраснай — на дзяцей. І ў гэтым сэнсе трэба арганізаваць кантроль за мэтавым выкарыстаннем такой дапамогі.

«Якая гэта будзе сістэма, шчыра кажучы, я не ведаю. Гэта няпростая будзе работа, і сістэму гэту распрацаваць будзе складана. У гэтым нам павінны дапамагчы людзі на месцах. Але гэта трэба рабіць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, неабходна выпрацаваць такую схему, каб мясцовая ўлада ведала кожную сям'ю, а з гэтым бываюць праблемы. «Калі б мы, атрымаўшы інфармацыю, убачылі б, што гэта алкашы і яны, атрымаўшы дапамогу, яе прап'юць, то мы б ужо самі кармілі гэтых дзяцей, апраналі, у школу адпраўлялі і вучылі там», — дадаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што дзеці павінны расці ў нармальных сем'ях, бо, на жаль, як паказвае практыка, у асацыяльных сем'ях часцей за ўсё вырастаюць асацыяльныя элементы, злачынцы.

Па просьбе прадстаўнікоў СМІ Аляксандр Лукашэнка раскрыў яшчэ адзін інсайд, які датычыцца фонду Першага. Ён расказаў, што гэта перш за ўсё дабрачынны фонд, які дазволіць сабраць сродкі ў адным месцы і дапамагаць тым, хто сапраўды мае ў гэтым патрэбу. «Я, можна сказаць, сваё імя туды аддаў — фонд Першага, каб мы маглі сабраць нейкія грошы і дапамагчы тым, хто мае патрэбу. Гэта галоўная яго задача», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, і чаму фонд з'явіўся. Па яго словах, пасля закрыцця шэрагу фондаў і арганізацый, якія пад выглядам дабрачыннасці займаліся палітыкай і спрабавалі ў 2020 годзе разгайдаць краіну, аказалася цяжка займацца дабрачыннасцю. «Тыя, хто нам дапамагаў і хоча дапамагчы, — юрыдычна не могуць. Тады я кажу: давайце пад эгідай Прэзідэнта створым гэты фонд, адкрыты абсалютна, каб людзі, якія ў гэты фонд уносяць сродкі, разумелі, куды ідуць гэтыя грошы», — сказаў беларускі лідар. Ён канстатаваў, што гэта прынцыпова павінен быць абсалютна адкрыты фонд. Пакуль фонд не пачаў актыўную дзейнасць: на яго рахунку яшчэ адсутнічаюць паступленні, няма кіраўніка і гэтак далей. Аляксандр Лукашэнка, таксама звярнуў увагу, што ў фондзе, які працуе пад патранатам Прэзідэнта, сродкі гарантавана раскрадзены не будуць.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*Брэсцкая вобласць*.

Фота БелТА.

❍ **У тэму**

## Асноўная задача — забяспечыць мір на тэрыторыі нашай краіны

Міністр абароны Віктар Хрэнін у размове з журналістамі нагадаў, што ў пачатку года Прэзідэнтам была пастаўлена задача яшчэ раз прааналізаваць, як арганізавана абарона краіны, і ўлічыць пры гэтым формы і спосабы вядзення баявых дзеянняў у суседняй краіне. «Мы прыйшлі да высновы, што неабходна ісці праз умацаваныя раёны, якія здольныя вытрымліваць удары авіяцыі, артылерыйскія налёты. Асноўны прынцып, які закладваецца, — аўтаномнасць вядзення баявых дзеянняў, захаванне жыццяў людзей і ўтрыманне пазіцый. Якраз такі ўмацаваны раён, яго магчымасці і прадэманстравалі кіраўніку дзяржавы», — расказаў Віктар Хрэнін. Па словах міністра, Галоўнакамандуючы ацаніў убачанае станоўча, таму далей Мінабароны будзе ісці па шляху арганізацыі такіх ліній абароны па краіне.

Віктар Хрэнін расказаў, што галоўная задача, якую ставіць Прэзідэнт перад ваеннымі, — не дапусціць развязвання вайны на нашай тэрыторыі, забяспечыць мір, абарону нашай дзяржавы. «Мы не проста аб гэтым гаворым, а на справе паказваем, што мы да гэтага рыхтуемся. Мы ніякія не агрэсары, як бы ні спрабавалі нашы заходнія суседзі спекуляваць на гэтым. Мы рыхтуемся абараняцца, абараняць сваю зямлю, і нікому ні кавалачка сваёй зямлі не аддадзім», — заявіў міністр. Ён таксама звярнуў увагу на пастаяннае ўкараненне новых узораў узбраення, абавязковых у сучасных умовах вядзення баявых дзеянняў, у прыватнасці, для супрацьстаяння ў артылерыйскай барацьбе, нападзе дронаў. «Мы працуем у цесным узаемадзеянні з ваенна-прамысловым комплексам, даводзім патрабаванні і задачы. Яны таксама навучыліся працаваць з колаў, укараняючы і распрацоўваючы менавіта тыя новыя сродкі, якія нам патрэбны», — сказаў Віктар Хрэнін.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Сірыі абвясцілі трохдзённую жалобу па ахвярах атакі тэрарыстаў на ваеннае вучылішча

Колькасць пацярпелых у выніку атакі тэрарыстаў на ваеннае вучылішча ў сірыйскім горадзе Хомсе перавысіла 270 чалавек, колькасць загінулых па меншай меры склала каля 90. Аб гэтым са спасылкай на Міністэрства аховы здароўя краіны паведаміла газета Al Hadath. Як вядома, 5 кастрычніка беспілотны лятальны апарат нанёс удар па ваенным вучылішчы ў горадзе Хомсе ў момант заканчэння цырымоніі выпуску курсантаў. Паводле існуючых звестак, большасць ахвяр і пацярпелых — сваякі сірыйскіх ваенных, якія былі запрошаны ў вучылішча. Сірыйскі ўрад абвясціў трохдзённую жалобу. Прайшлі пахаванні загінулых.

**Спачуванні Прэзідэнту Сірыі Башару Асаду накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Бессэнсоўнае забойства абарвала жыцці маладых грамадзян, патрыётаў Сірыі, якія сваімі мэтамі абралі абарону інтарэсаў сваёй Бацькаўшчыны і вяртанне ў да мірнага жыцця», — адзначаецца ў спачуванні. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што тэрарызм ва ўсіх яго формах і праявах не можа мець ніякага апраўдання і не павінен заставацца без кансалідаванай рэакцыі сусветнай грамадскасці. «У гэту цяжкую хвіліну мы смуткуем разам з брацкім народам Сірыйскай Арабскай Рэспублікі па загінулых, дасылаем словы падтрымкі і спагады іх сем'ям, а таксама жадаем як мага больш хуткага выздараўлення параненым», — адзначыў беларускі лідар.**

### Еўропа знаходзіцца на мяжы рэцэсіі

Стары Свет знаходзіцца на мяжы рэцэсіі ва ўмовах хуткага ўзмацнення жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі і моцных эканамічных узрушэнняў. Пра гэта гаворыцца ў новым дакладзе Канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД), паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. У дакладзе адзначаецца, што рост эканомікі найбуйнейшых еўрапейскіх краін запавольваецца, а ў Германіі і ўвогуле ўжо назіраецца эканамічны спад. Паводле даных ЮНКТАД, рост эканомікі ў Еўропе стрымліваe стагнацыя або зніжэнне рэальнай заработнай платы, пагаршаецца мерамі жорсткай эканомікі бюджэтных сродкаў. У дакладзе таксама адзначаецца, што з краін «вялікай дваццаткі» паляпшэнне паказчыкаў росту чакаецца ў Бразіліі, Кітаі, Расіі, Мексіцы і Японіі. Паводле прагнозаў экспертаў арганізацыі, тэмпы росту сусветнай эканомікі сёлета замарудзяцца да 2,4 працэнта ў параўнанні з 3 працэнтамі ў мінулым годзе. Яны таксама папярэджваюць, што пакуль «мала што сведчыць аб аднаўленні росту ў наступным годзе».

### У Кеніі звыш 100 школьніц трапілі ў бальніцу пасля ўспышкі загадкавай хваробы

Надзвычайнае здарэнне адбылося ў горадзе Эрэгі, які знаходзіцца на захадзе Кеніі. Пра гэта паведамляюць РІА «Новости» са спасылкай на мясцовае выданне Star. Як адзначаецца ў публікацыі, міністэрства адукацыі прыняло рашэнне зачыніць жаночую сярэднюю школу. Гэта было зроблена пасля таго, як вучаніцы трапілі ва ўстанову аховы здароўя з прычыны загадкавага захворвання. Паводле наяўных даных, невядомая хвароба паралізавала ніжнія канечнасці дзяўчынак, большая частка з іх не можа перамяшчацца. Каля тысячы школьніц былі адпраўлены дадому, а 106 дзяўчынак трапілі ў бальніцу. На словах аднаго з медработнікаў, першасныя лабараторныя аналізы крыві выявілі ў хворых павышаны ўзровень электралітаў. Гэта значыць, што арганізмы школьніц губляюць вадкасць.

**Работнікі Сакратарыята Савета МПА СНД выказваюць глыбокае спачуванне намесніку Генеральнага сакратара Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў — паўнамоцнаму прадстаўніку Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Віктару Рыгоравічу Когуту ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Віктару Рыгоравічу Когуту, намесніку Генеральнага сакратара Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў — паўнамоцнаму прадстаўніку Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

Актуальная тэма

# КАЛІ ВЫРАШАЕ БОЛЬШАСЦЬ...

## Пытанні, якія хвалююць членаў сумесных домаўладанняў

**У рэдакцыю звярнулася жыхарка аднаго са сталічных шматпавярховікаў. Яна скардзіцца на старшыню свайго таварыства ўласнікаў (далей — ТУ). Вось толькі асобныя вытрымкі з яе ліста ў пераказе.** *(«Наша ТУ адзінае ў раёне ўпаўнаважана Адміністрацыяй на ўлік, разлік і налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі. Але мне хацелася б абслугоўвацца ў разлікова-даведачным цэнтры (далей — РДЦ), як і большасці мінчан. Бо гэта вельмі зручна: можна прыйсці практычна ў любы дзень з 9 да 20 гадзін, уключаючы суботу, у любое РДЦ горада па прынцыпе экстэрытарыяльнасці, у камфортных умовах (дарэчы, месца прыёму грамадзян у нашым ТУ больш падобна на склад, чым на офіс) атрымаць даведку, заказаць электроннае апавяшчэнне на аплату, звярнуцца ў службу 115.бел... Але мы пакуль, як прыгонныя, прывязаныя да гэтага дрымучага сярэднявечча — да вольнай на самаўпраўства старшыні, якая прымае толькі раз на тыдзень з 17 да 19 па панядзелках (і не заўсёды адказвае на тэлефонныя званкі), ды да маленькай паштовай скрыні на будцы дыспетчараў, якая з'явілася і тое па рэкамендацыі Адміністрацыі раёна. Усё ў нашым таварыстве завязана на асабістых сімпатыях і антыпатыях старшыні праўлення. Яна адна для нас і ёсць цэлае РДЦ. Пашпартыста ў твар ніхто не ведае, яна лічыцца фармальна. Функцыі галоўнага бухгалтара таксама выконвае старшыня, паколькі галоўны бухгалтар — 1949 года нараджэння, без эканамічнай адукацыі. Калі ўсе функцыі і кіраўніка, і выканаўцаў сыходзяцца на адным чалавеку — гэта спараджае перадузятасць і злоўжыванне. Агульныя сходы, якія павінны праводзіцца не радзей чым адзін раз на год, у нашым ТУ праводзяцца з парушэннямі тэрмінаў. Усе фінансавыя пытанні (справаздачы, штатны расклад і каштарыс) вырашаюцца самой старшынёй выключна «заднім чыслом». Яна парушыла ўсё, што можна парушыць, а адказнасці за гэта не дабіцца. Па законе жыхары павінны прымаць рашэнні і кантраляваць іх выкананне, але на практыцы мы сталі рабамі і нават не можам выказваць свой пункт гледжання, бо, каб атрымаць прыязнае стаўленне старшыні, трэба ва ўсім з ёй пагаджацца».*

**Гэтае і іншыя пытанні, якія хвалююць нашых чытачоў, мы пераадрасавалі начальніку аддзела па эксплуатацыі жыллёвага фонду, арганізацыі і правядзенні жыллёвай рэформы ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Надзеі СЕЎРУК.**

### ПРА АДМІНІСТРАЦЫЙНУЮ АДКАЗНАСЦЬ І СПРОШЧАНЫ КВОРУМ

***— Наколькі рэальна перайсці ў РДЦ, калі праўленне і старшыня ТУ супраць?***

— Рашэнне аб упаўнаважванні ТУ на ўлік, разлік і налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі праз АІС «Разлік-ЖКП» прымала адміністрацыя раёна. І толькі яна можа яго адмяніць, калі палічыць, што ТУ не спраўляецца. Ніхто не забараняе адміністрацыі ўлічыць меркаванне большасці жыхароў. Але трэба разумець, што слова агульнага сходу ў гэтым выпадку не асноўнае, канчатковае рашэнне па гэтым пытанні за адміністрацыяй.

***— Наколькі проста на практыцы замяніць старшыню ТУ, які не задавальняе?***

— Калі дырэктар не задаволены сваім работнікам, ён яго звальняе. Так і тут, члены ТУ — наймальнікі гэтага старшыні, таму яны могуць у любы момант яго звольніць рашэннем агульнага сходу. І наняць на працу новага чалавека. На практыцы вельмі часта меркаванне раздзяляецца: адна група людзей задаволена старшынёй, другая — не. Паколькі шматкватэрны дом мае шмат уласнікаў, заканадаўствам прадугледжана сістэма прыняцця рашэнняў простай большасцю галасоў. Калі члены праўлення не зацікаўлены ў замене старшыні, людзі могуць сабраць 1/4 подпісаў ад агульнай колькасці ўласнікаў, і тады праўленне абавязана будзе правесці пазачарговы сход па патрабаванні. І ўжо на сходзе большасцю галасоў вырашаюць, пакінуць старшыню ці датэрмінова спыніць з ім працоўныя адносіны.

***— У якім выпадку мясцовыя ўлады могуць умешвацца ў дзейнасць ТУ? Якія ў іх абавязкі як кантралявальнага органа?***

— Проста так адміністрацыя раёна не можа ўмешвацца ў дзейнасць іншай юр. асобы. На гэта павінны быць прычыны. У прыватнасці, яна павінна праводзіць разбіральніцтвы па звароце грамадзян, каб абараніць іх правы. У 186 артыкуле Жыллёвага кодэкса прапісаны выпадкі, калі адміністрацыя раёна мае права ініцыяваць правядзенне агульнага сходу па пытанні аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў старшыні. У прыватнасці, калі старшыня ТУ быў два і больш разоў на працягу года прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Калі праўленне не функцыянуе, то мясцовы выканкам прыступае да арганізацыі агульнага сходу сам. У гэтым выпадку заканадаўствам прадугледжаны спрошчаны кворум, для прыняцця рашэння дастаткова прысутнасці на ім не менш чым двух членаў арганізацыі ўласнікаў. Калі агульны сход не мае кандыдатаў на месца старшыні, то мясцовы орган улады мусіць прызначыць часовага кіраўніка.

### ПРА ФУТБОЛЬНЫЯ ВАРОТЫ І ПЯЦЬ ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦ

***«Агульныя сходы, якія павінны праводзіцца не радзей чым адзін раз на год, у нашым ТУ пастаянна праводзяцца з парушэннямі тэрмінаў, пераносяцца па некалькі разоў. Наколькі гэта законна?»***

— Старшыня абавязаны штогод да 31 сакавіка правесці агульны сход, на якім даць справаздачу аб дзейнасці арганізацыі ўласнікаў за папярэдні перыяд і спланаваць наступны. У выпадку парушэння заканадаўства, як і каго караць у індывідуальным парадку, прымае рашэнне адміністрацыя раёна. Калі агульны сход не праведзены па віне старшыні ТУ, тады адміністрацыя павінна выпісаць прадпісанне і прымусіць яго правесці гэты сход. Калі ж старшыня прыняў усе меры, але кворум не адбыўся, бо людзі не прынялі ўдзел у галасаванні, гэта зусім іншая справа.

***— Апошнім часам у многіх таварыствах уласнікаў праводзяць завочныя сходы ў выглядзе пісьмовых апытанняў. Наколькі гэта мэтазгодная практыка? Ад многіх членаў таварыстваў чула, што яны не давяраюць такім сходам, маўляў, такая форма зносінаў не «празрыстая» і пазбаўляе іх магчымасці ўплываць на прыняцце ключавых рашэнняў, скардзяцца, што ў іх нават няма магчымасці выказаць сваю пазіцыю, задаць удакладняльныя пытанні?***

— Калі мы кажам пра вялікія дамы, то, як правіла, усіх сабраць вельмі праблематычна. Часта здараецца, што ТУ страціла грошы на арэнду актавай залы, а на сход не сабраўся патрэбны кворум. Таму гэта вельмі частая практыка апошнім часам у арганізацыях уласнікаў, калі яны праводзяць агульны сход шляхам пісьмовага апытання. У плане абмеркавання — так, сапраўды дыскусію не правядзеш. Але ў плане празрыстасці тут пытанне спрэчнае, бо бюлетэнь — гэта волевыяўленне на паперы, якое з подпісам і датай вяртаецца ў праўленне. Апошняе падлічвае галасы, складае пратакол і захоўвае іх. Маё меркаванне, складзенае з практыкі: тут пытанне толькі ў арганізацыі работы старшыні праўлення і членаў праўлення, як яны наладзілі ўзаемадзеянне з уласнікамі кватэр. Канешне, калі людзі просяць уключыць у парадак дня нейкае пытанне, а праўленне ігнаруе, гэта нагода падумаць пра тое, каб змяніць склад праўлення.

***«Наша праўленне пастаянна фантануе ідэямі: давайце пабудуем велабокс, паставім яшчэ адну дзіцячую горку, футбольныя вароты, дайшло да таго, што прапаноўвалі наняць чалавека, які б вычэсваў мох з травы... Калі агульны сход прагаласуе «за», то я буду вымушана таксама плаціць за празмернасці, якія мне не патрэбныя і якімі я ніколі не буду карыстацца (веласіпед я захоўваю дома, і дзяцей у мяне няма)? Ці прадугледжвае заканадаўства механізм абароны чалавека ад неабгрунтаваных пабораў і нерацыянальнага выкарыстання плацяжоў членаў таварыства?»***

— Ёсць абавязковыя расходы, ад якіх член ТУ не можа адмовіцца. А ёсць пытанні камфорту. Калі мы кажам пра футбольныя вароты, то тут дапускаецца індывідуальны падыход. Калі старшыня ТУ бачыць, што паўдома пажылых людзей, якім футбольныя вароты не патрэбныя, то цалкам можна ўскласці аплату гэтых варот на тых людзей, якія хочуць іх устанавіць.

Рашэнне аб устаноўцы сістэмы відэаназірання, шлагбаума, найме кансьержа ці садоўніка прымае агульны сход. Усе запланаваныя расходы павінны быць уключаны ў каштарыс ТУ, які зацвярджае агульны сход. Раз на год яго трэба людзям паказаць, каб яны разумелі за што плацяць. Калі вычэсванне моху з травы вам не патрэбна, дык не зацвярджайце такі каштарыс. Але ў нас усё вырашаецца большасцю. Бо калі існуе шмат уласнікаў адной агульнай маёмасці, дагадзіць, як правіла, усім немагчыма. Варта адзначыць, што ад паслуг, якія ўключаны ў пералік дадатковых жыллёва-камунальных паслуг, нязгодны ўласнік мае права адмовіцца і не аплачваць іх, нават калі большасць прагаласавала «за».

Перад тым, як набыць кватэру, чалавек павінен ацаніць памер членскіх і мэтавых узносаў у ТУ, каб разумець, ці гатовы ён плаціць дадаткова за павышаны ўзровень камфорту. Проста адзін дом хоча больш камфортных умоў пражывання, іншаму дастаткова тых, якія ёсць на этапе пакупкі памяшкання. Абмежаваўшы заканадаўствам наймаць кансьержа ці садоўніка, мы пазбавім грамадзян права выбіраць умовы свайго пражывання. А гэта недапушчальна.

***«Штатны расклад у нашым ТУ неабгрунтавана раздзьмуты, можна было б трымаць значна менш прыбіральшчыц, і было б больш толку. Але маё меркаванне ніхто не ўлічвае... Як можна змяніць сітуацыю?»***

— Штатны расклад складаецца старшынёй, але ён павінен быць штогод узгоднены агульным сходам. Калі агульны сход узгадніў пяць прыбіральшчыц, зноў-такі, прынцып большасці, астатнім нічога не застаецца, як падпарадкавацца. Калі вырашылі, што дастаткова ранейшых дзвюх, то старшыня абавязаны пакінуць штатны расклад без змяненняў. Калі старшыня памяняў штатны расклад і не ўзгадніў з агульным сходам — гэта парушэнне заканадаўства. Тое ж самае датычыцца павышэння памеру членскага ўзносу. Калі жыхары не знаходзяць узаемапаразумення з органамі кіравання ТУ, яны могуць звярнуцца ў мясцовы выканкам. Апошні, калі не выконваецца жыллёвае заканадаўства, абавязаны выдаць прадпісанне старшыні і, калі той не выпраўляе сітуацыю, прыцягнуць яго да адміністрацыйнай адказнасці. Чым актыўней жыхары прымаюць удзел у жыцці свайго ТУ, тым меншая верагоднасць, што старшыня ці праўленне будуць злоўжываць нормамі закона. Калі вы не згодны з рашэннем агульнага сходу, лічыце што яно было незаконным, у вас ёсць права падаць іск у суд. Бо адмяніць рашэнне агульнага сходу і прызнаць яго несапраўдным можа толькі агульны сход альбо суддзя.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## МЕРКАВАННЕ

**Генадзь КАЛЁНАЎ, мадэратар міжнароднага таварыства менеджараў нерухомасці, уваходзіць у грамадскі кансультацыйны савет па прадпрымальніцтве пра Міністэрстве ЖКГ:**

«У большасці краін, перш чым здаць дом у эксплуатацыю, ствараецца дакумент аб сумесным домаўладанні. Там прапісаны ўвесь звод правіл для аднаго канкрэтнага дома. Калі чалавек набывае ў ім кватэру, ён атрымлівае на рукі гэтую своеасаблівую «біблію», дзе даступнай мовай распісаны правы, абавязкі, забароны, адказнасць. І гэтыя правілы змяніць можна толькі пры 100 % згодзе ўсіх уласнікаў кватэр, што зрабіць вельмі складана, таму яны павінны быць дасканала выверанымі, прааналізаванымі і не супярэчыць нацыянальнаму заканадаўству. Тады і спецыялістам, якія займаюцца кіраваннем сумеснымі домаўладаннямі, значна прасцей арыентавацца. Іх задача — проста сачыць за выкананнем гэтых правіл. І, як паказвае міжнародная практыка, адзін кіраўнік–прафесіянал можа спакойна кіраваць да 40 пяціпавярховымі дамамі. У беларускім заканадаўстве правілы таксама ёсць, але яны рассыпаны, як гарох, па розных заканадаўчых актах: частка — у Жыллёвым кодэксе, частка — у Працоўным, частка — у пастановах Савета Міністраў...

Многія праблемы могуць быць і ў некампетэнтнасці старшыняў ТУ. Калі мы хочам эксплуатаваць нашы дамы добра і доўга, самакіраванне павінна спалучацца з прафесіяналізмам. Нам патрэбна прафесійнае кіраванне нерухомасцю. Чалавек, якога выбралі ў праўленне — не прафесіянал. Гэта проста прадстаўнік грамадскасці. Ён і не павінен быць кампетэнтным спецыялістам. Самае галоўнае, каб члены праўлення валодалі высокімі чалавечымі якасцямі — бескарыслівасцю, працалюбствам, добразычлівасцю, бо іх работа не аплачваецца. Людзі займаюцца ёй на грамадскіх пачатках, страчваюць свой асабісты час, бо адчуваюць адказнасць за свой дом, хочуць клапаціцца пра агульны дабрабыт. Але як гэта рабіць, не ведаюць. Таму і наймаюць на конкурснай аснове прафесійнага кіраўніка. Ён ведае, як кіраваць сумеснымі домаўладаннямі, бо яго гэтаму вучылі. І, што немалаважна, гэты чалавек валодае стрэсаўстойлівасцю, умее правільна кантактаваць з рознымі людзьмі, пастаянна праходзіць сертыфікацыю, здае экзамены, павышае кваліфікацыю».

## Дарэчы

Цяпер праходзіць грамадскае абмеркаванне **законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях упраўлення жыллёвым фондам і яго эксплуатацыі».** Яго мэта — ліквідаваць прабелы і ўрэгуляваць некаторыя праблемныя пытанні ў дзейнасці таварыстваў і іншых арганізацый уласнікаў. Сярод прапанаваных навацый — узмацніць адказнасць старшыняў праўлення за невыкананне законаў па кіраванні агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання ды за невыкананне прадпісанняў мясцовых улад, змяніць падыходы да акумулявання ўзносаў на капрамонт. Калі цяпер старшыня мае права займацца некалькімі жылымі дамамі, то ў будучыні, магчыма, зможа працаваць толькі ў адным ТУ. Як расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Віктар НІКАЛАЙКІН**, з 22 верасня да 2 кастрычніка далі магчымасць выказацца ўсім ахвотным, і людзі актыўна пакідалі свае заўвагі і прапановы. «Па асобных пытаннях прагучалі дыяметральна супрацьлеглыя меркаванні, таму вырашылі прыцягнуць спецыялістаў, экспертаў, каб яшчэ раз усё дасканала прааналізаваць і вывесці найбольш аптымальнае рашэнне. Мы ўжо пачалі рассылаць праект закона па ўсіх зацікаўленых арганізацыях. Шмат людзей не задаволены стаўленнем старшыняў да сваёй працы, аб чым сведчыць вялікая колькасць скаргаў. Таму трэба ўдасканальваць заканадаўства, штосьці мяняць, але пры гэтым не сячы з-за пляча, не ламаць тое, што ўжо добра працуе», — адзначыў дэпутат.

# Званы ад маршала Жукава

## Са сшытка старасты

Ніна Васілюк — не толькі стараста вёскі Амелянец, але і руплівіца царкоўных спраў. Пра вёску, яе ваколіцы, суседнія населеныя пункты, а таксама пра гісторыю храма можа расказаць грунтоўна. І не толькі па памяці. У вялікім адмысловым сшытку ў яе запісаны даты, падзеі, прозвішчы. Асобным раздзелам ідзе спіс з біяграфічнымі звесткамі святароў тутэйшага храма з пачатку XX стагоддзя. Напрыклад, адзін з іх Сямён Ярашук быў франтавіком, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Айцец Сямён служыў тут да пачатку 90-х і пахаваны побач з царквой.

Ніна Паўлаўна не настаўніца, не работнік культуры ў мінулым, яна былы сельскі прадавец і загадчыца фермы. Але мінуўшчынай сваёй мясцовасці заўсёды цікавілася, з часам запісваць пачала, як яна кажа, для памяці. Можа, дзецям, унукам, праўнукам спатрэбіцца. Хоць жанчыне няма яшчэ сямідзесяці, у іх з мужам ужо і праўнук у школу ходзіць.

## Адбудаваная пасля двух пажараў

Гісторыя ў гэтага храма сапраўды цікавая. Першапачаткова царква ў Амелянцы была ўзведзена недзе каля 1713 года. Захаваліся дакументы, якія ўказваюць, што ў 1836 годзе храм быў значна пашыраны ў выніку перабудовы. Варта яшчэ сказаць, што ён адрозніваецца ад большасці драўляных цэркваў Брэстчыны незвычайным для захаду Беларусі рэтраспектыўна-рускім стылем. Падчас Першай сусветнай вайны царква моцна пацярпела, была пашкоджана званіца, асколкамі і кулямі пабітыя дах і сцены. У 1922 годзе, калі вяскоўцы пасля эвакуацыі вярнуліся дадому, вырашылі адрамантаваць святыню. Але вясной наступнага года ад удару маланкі згарэў купал. А ў 1925 годзе зноў здарыўся пажар. Ноччу людзі пачулі выбух, адкрылі дзверы храма, але ўвайсці ўнутр не змаглі, там бушаваў пажар. Агонь нібы абрынуўся са столі, і пабудова згарэла датла. Ніхто так і не дазнаўся, што стала прычынай узгарання.

Атрыманых выплат па страхоўцы хапіла, каб купіць зруб гатовай царквы ў Яблачынскім манастыры на тэрыторыі цяперашняй Польшчы. Тамтэйшую царкву збіраліся закрываць, пакупка для яе азначала далейшае жыццё. Пабудову разабралі і па чыгунцы давезлі праз Дубіцу да станцыі Чарамха. Адтуль жыхары Амелянца перавезлі яе падводамі. Узвядзенне новага храма пачалося ў 1927 годзе, а ў 1930 годзе яго ўжо асвяцілі ў гонар Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і пачалі праводзіць службы. Сюды вярнулася схаванае клапатлівымі прыхаджанамі перад вайной дабро. А вось старадаўнія званы не ўдалося знайсці. Гаварылі, што, магчыма, іх вывезлі ў Германію... Карацей, у 1930 годзе царква пачала новую старонку гісторыі, з той пары службы тут не перапыняліся, яны працягваліся і ў вайну, і ў пасляваенны час ваяўнічага атэізму.

## Снарады праляталі міма

Старажылы ў розны час расказвалі нямала цікавых гісторый, звязаных з царквой, з яе званіцай. Яны занатаваныя ў сшытку

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ніны Васілюк. Напрыклад, падчас апошняй вайны на званіцы хаваўся савецкі карэкціроўшчык агню, бо лінія фронту праходзіла паблізу. Яго нейкім чынам немцы заўважылі, хацелі ліквідаваць, старанна абстрэльвалі храм. Але — цуд, усё навокал разбілі, толькі ніводная куля, ніводзін снарад не даляцелі да цэлі. Казалі нават, што той салдат спусціўся ўніз пасівелы.

— Яно і зразумела, — разважае Ніна Паўлаўна, — тут жа ўсё як на далоні, любы снарад мог разнесці драўляную званіцу на дробныя кавалкі. А яны ўсе ляцелі міма, адно тлумачэнне засталося — Бог збярог.

## Пасылка ад маршала Перамогі

У час вайны настаяцелем царквы быў Яўген Місюк. Адразу пасля вызвалення прыхаджане сталі вязаць шкарпэткі, рукавіцы, збіралі прадукты для патрэб фронту. На пасылках звычайна пісалі «На фронт. Жукаву». Адны вяскоўцы сцвярджалі, што айцец Яўген напісаў маршалу ліст, у якім павіншаваў з Перамогай. Другія казалі, што Жукаў прыслаў ліст з падзякай за дапамогу франтавікам і пытаў, чым дапамагчы прыходу, тады і папрасіў святар званы для царквы. Адным словам, завязалася перапіска ў святара з маршалам. Адноічы айцец Яўген аб'явіў прыхаджанам, што палкаводзец абяцаў званы для Амелянца. І праўда, неўзабаве ў вёску прыйшла «пасылка» вагой больш за тону. Званы прывезлі салдаты. Потым казалі, што званы былі знойдзены ў адным з нямецкіх эшалонаў, падрыхтаваныя для адпраўкі ў Германію, а Жукаў распарадзіўся адправіць іх у Амелянец. Дарэчы, нястомны бацюшка Яўген Місюк пазней быў узнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

...На адным са званоў, якія прывезлі ў вёску, зроблены надпіс на царкоўнаславянскай, на двух другіх — на рускай мове. Адзін, паводле надпісу, адліты для царквы ў Антопалі, другі — для Грушаўкі. Антопаль ёсць у Драгічынскім раёне, Грушаўка — назва распаўсюджаная. Хутчэй за ўсё, легенда праўдзівая наконт падрыхтоўкі для вывазу ў Германію, які нашым войскам удалося папярэдзіць.

## Абнаўленне і добраўпарадкаванне

Адным словам, Амелянец атрымаў званы, якія ўжо без малога 80 гадоў склікаюць сваіх вернікаў да храма, абвяшчаюць пра святы. А Ніна Васілюк зараз кіруе і царкоўным хорам. Спачатку была толькі ў ліку пеўчых, а пасля сыходу з жыцця былой кіраўніцы давялося ёй хор узначаліць. Расказвае, што па першым часе вельмі хвалявалася, але ж усё атрымалася. Яна таксама актыўная памочніца цяперашняга святара Ігара Пяркоўскага ў клопатах пра рамонт і добраўпарадкаванне храма.

Цяперашні настаяцель прыйшоў на службу ў 2009 годзе і фактычна адразу заняўся рамонтам, які працягваўся дзевяць гадоў. Усё зрабілі грунтоўна: памянялі выгляд сцен, замянілі падлогу, цалкам абнавілі фасад, дах. Купалы здымалі з дапамогай спецыяльнай тэхнікі. Ремонт зацягнуўся, бо храм



з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Любую работу даводзілася ўзгадняць з адпаведнымі ведамствамі. Але ўсе этапы паспяхова пройдзены, цяпер храм выглядае прыгожым, дагледжаным. Нават мікрафон купілі для ўзмацнення гуку. Цяпер, дарэчы, у храме працуе майстар-іканапісец з майстэрні горада Уладзіміра. Некалькі гадоў таму ён распісваў іканастас, а цяпер займаецца рэстаўрацыяй асобных абразоў.

Ну, а добраўпарадкаванне — справа пастаянная. Два гады таму Ніна Васілюк была ініцыятарам пасадкі туй на падворку. Прайшла па дварах, грошы сабралі, купілі 70 саджанцаў. Сама і садзіла іх з дзвюма прыхаджанкамі, айцец Ігар дапамагаў. Трэба было потым дрэўцы паліваць, брала ваду ў суседнім доме, гэта было не надта зручна і далекавата. Сама купіла гідрафор, потым прабілі калонку, і каля царквы з той пары ёсць вада. За гідрафор ёй, праўда, грошы пазней сабралі. Вяскоўцы рэгулярна ахвяруюць на сваю царкву, здаўна набожныя людзі жылі ў Амелянцы. Сведчаннем таму — яшчэ адна гісторыя.

На тэрыторыі могілак доўгі час стаяла невялікая цэркаўка, у ёй вялі службы, калі, напрыклад, храм рамантавалі пасля пажараў. Дык вось у шасцідзесятыя гады ў калідорах улады некаму прыйшло ў галаву яе разабраць. Работу даручылі дырэктару школы. Той узяў старшакласнікаў і пайшоў да царквы. Яны паспелі толькі зняць дах, як з суседняй фермы наляцелі жанчыны. Хто з матыкай, хто з віламі, хто з кіем — разагналі тую гора-брыгаду ўмомант. Больш ніхто не падыходзіў да цэркаўкі, толькі без даху яна і сама стала паступова разбурацца. Але пасля таго інцыдэнту ніхто не адважваўся чапаць і вялікі храм. Дачакалася сваёй чаргі і тая капліца. Яе таксама адрамантавалі і прывялі ў парадак.

## Да вайны і пасля яе

Паводле слоў Ніны Васілюк, у вайну ў параўнанні з іншымі населенымі пунктамі Амелянцу адносна пашанцавала. Вёску не палілі, людзей не забівалі. Вядома, жыхары ўсялякага нацярпеліся ў акупацыю:

— Мае бацькі жылі на хутары, фактычна ў лесе, — расказвае жанчына. — Немцы прыехалі, загадалі бацьку на працягу трох сутак пакінуць хутар, у адваротным выпадку, сказалі, спаляць. Уяўляеце, што такое перавезці хату, гаспадарчыя пабудовы за тры дні? Мяне яшчэ не было, але ў бацькоў ужо шасцёра дзяцей гадавалася. Ведаю ад іх, што спачатку на санях перацягнулі на новае месца хлеў, каб было дзе скаціну паставіць. У тым хляве і туліліся ўсе разам некаторы час. А хату разабралі, потым ужо перавозілі бярвенні часткамі, яе ж у адзін дзень не складзеш. Адным словам, гора хапіла. Маці ўспамінала, як не раз забіралі прадукты, маёмасць. Тры каровы трымалі, вялікую сям'ю трэба было карміць. Маці казала, што часам пасля іх налётаў заставалася толькі тое, што паспявала схапіць са стала і схаваць у калысцы з самым меншым.

Пасля Перамогі жыццё стала наладжвацца. І ўжо на пачатак 70-х гадоў Амелянец быў вялікім населеным пунктам, цэнтрам гаспадаркі. Тут размяшчалася сярэдняя школа, працавалі ўсе аб'екты сацкультбыту. Таму ў ліку першых у раёне населены пункт атрымаў статус аграгарадка. Але ў выніку рэарганізацыі сельгаспрадпрыемства было далучана да іншага. Паступова закрылі ФАП, потым — школу. Сёння засталіся Дом культуры з бібліятэкай, дзіцячы садок, пошта і магазін.

Тутэйшы бібліятэкар Любоў Казачук расказала, што шмат гадоў збірае матэрыялы пра свой населены пункт.

— Як і ўсе бібліятэкары, цікаўлюся звесткамі пра мінулае вёскі, у свой час работу пісала на гэтую тэму, — гаворыць Любоў Іванаўна. — Знайшла, напрыклад, легенду аб паходжанні назвы. Паводле падання, назва звязаная з мноствам вадзяных млыноў, якія акружалі паселішча, утворанае ў XVII стагоддзі для асочнікаў, вартаўнікоў Белавежскай пушчы. Яны павінны былі ахоўваць царскія ўгоддзі ад самавольнага захопу. Але ж уся пазнейшая гісторыя Амелянца цесна пераплеценая з храмам. Бо ён быў галоўнай святыняй для людзей, цэнтрам духоўнага жыцця. У гэтым годзе нас пакінулі самыя сталыя жанчыны вёскі: адной было 99 гадоў, другой — 98. Яны многа расказвалі ў свой час пра храм.

І цяпер асноўныя мерапрыемствы бібліятэкі так ці іначай звязаныя з гэтай тэмай, большасць актыўных чытачоў дасягнулі пенсіённага ўзросту. У бібліятэцы значыцца 180 наведвальнікаў. А пражывае ў Амелянцы па стане на 1 студзеня 259 чалавек. Ну, вядома, Ніна Паўлаўна ў нас актывістка ва ўсіх справах, гаворыць бібліятэкар.

Апошняе адзначае і **старшыня Камянецкага раённага Савета дэпутатаў Ірына НІГЕРЫШ**:

— Не так даўно стараста вёскі Ніна Васілюк была адзначана граматай раённага Савета за актыўную грамадскую работу. Напрыклад, у гэтым месяцы пад яе кіраўніцтвам і наглядам зносяць аварыйныя дрэвы на могілках. Яна арганізоўвае пенсіянераў на штогадовае правядзенне флюараграфіі ў Вярховічах. Ведаю, што і на мінулым тыдні прабеглася па вёсцы, склала спіс, а сельсавет ужо паспрыяў з транспартам. Яна першай прыходзіць на дапамогу старым, адзінокім людзям у самых розных бытавых пытаннях. А яшчэ Ніна Паўлаўна цудоўна вышывае і не раз была ўдзельніцай розных выстаў. Яе паважаюць у вёсцы, да яе меркавання прыслухоўваюцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

*Камянецкі раён.*

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Собственник имущества** | ООО «Белскладкомплекс-3», 223050, Минская обл., Минский р-н, с/с Колодищанский, аг. Колодищи, ул. Чкалова, д. 37, оф. 7 |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, в долл. США в эквиваленте по курсу Нац. банка РБ на день проведения торгов с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| **1** | Капитальное строение (автовесовая), расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37А/3, общей площадью 150,1 м². Назначение – здание специализированное автомобильного транспорта | 29 100,00 |
| **2** | Гараж, расположенный по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37А/1, общей площадью 855,4 м². Назначение – здание специализированное транспорта | 177 000,00 |
| **3** | Здание хранилища № 32, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37Б, общей площадью 2 156,9 м². Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 315 000,00 |
| **4** | Здание хранилища № 25, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37Б/1, общей площадью 2 072,6 м². Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 308 000,00 |
| **5** | Здание склада № 20, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37Б/5, общей площадью 437,8 м². Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 66 300,00 |
| **6** | Здание хранилища № 8, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37Б/2, общей площадью 325,8 м². Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 43 600,00 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 (тридцать) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенном по адресам:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **0,7 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит до 500 тыс. белорусских рублей, 0,4 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит свыше 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Объекты аукциона не находятся под арестом, судебный спор по ним не ведется, отсутствуют обременения третьих лиц (кроме ипотеки ОАО «Банк БелВЭБ», которая будет снята после оплаты покупателем стоимости объекта аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 09.11.2023, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 08.11.2023 г. до 16.00 |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

Уважаемые акционеры!

ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» уведомляет о созыве и проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 24 октября 2023 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Повестка дня собрания:

1. О выплате дивидендов.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00 по месту его проведения.

Для регистрации иметь при себе следующие документы: акционеру общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

Дата сбора реестра и списка лиц владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания – 12.10.2023.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания в течение 7 дней до проведения собрания и в день проведения собрания по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49 с 11 до 14 часов, а в день проведения собрания – с 9.00 до 11.00.

Справки по телефону: 8 (0232) 341817.

Наблюдательный совет

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», находящееся в Республике Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, на основании решения наблюдательного совета от 05.10.2023 для проведения внеочередного общего собрания акционеров определило дату формирования реестра акционеров – 12.10.2023.

УНП 400078768

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении **9 ноября 2023 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества |
|---|---|
| | Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42 |
| 1 | **Модернизация FINNPAK (ИНВ 1486), инв. 2706** **Начальная** цена продажи с НДС – 19 055,00 бел. руб. **Задаток** – 250,00 бел. руб. |
| 2 | **Rotex, инв. 1168** **Начальная** цена продажи с НДС – 4 500,00 бел. руб. **Задаток** – 250,00 бел. руб. |
| 3 | Доля в размере 100 % уставного фонда Общества с ограниченной ответственностью «ПолимизБел» (ООО «ПолимизБел»), расположенного по адресу: г. Москва, вн. тер. г. Муниципальный округ Чертаново Северное, ш. Варшавское, д. 125, стр. 1, секция/этаж 7/5, часть пом./помещ. 24/25. Номинальная стоимость доли 6 908 000 рос. руб. **Начальная** цена продажи с НДС – 180 837,36 бел. руб. **Задаток** – 250,00 бел. руб. |

**Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз»**, Минская обл., г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.

Конт. тел. +375296555051.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 08.11.2023 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **ОАО «Полеспечать»** (УНН 400062502) 246015, г. Гомель, ул. Лепешинского, 1, тел./факс +375291475023.

Первые повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **24 октября 2023 г. 11.00.**

**Место проведения торгов:** г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, оф. 28.

Предмет торгов – имущественный комплекс:

### Комплекс имущества ОАО «Полеспечать» в составе:

1. капитального строения с инвентарным номером 340/С-29090, общей площадью 1009,2 кв. м, наименование – производственный корпус, целевое назначение – здание административно-хозяйственное, имеющего следующие составные части и принадлежности: два навеса, калитка металлическая с инв. № 170104, ворота металлические откатные с инв. № 170103, забор металлический с инв. № 170106; отопительные котлы каскадной системы с инв. № 170134 в количестве двух штук; лифт ЛМШ-150 с инв. № 170020, расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, ул. Урицкого, 19В;

2. капитального строения с инвентарным номером 340/С-29089, общей площадью 549,5 кв. м, наименование – складские помещения, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, ул. Урицкого, 19В/1;

3. капитального строения с инвентарным номером 340/С-3202498, наименование – электросети, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженностью – 40,8 м, расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, кабельная линия от ТП № 2 до ЩЭУ административно-хозяйственного здания и до ВРУ здания склада по ул. Урицкого, 19В;

4. капитального строения с инвентарным номером 340/С-3202499, площадью 130 кв. м, наименование – асфальтовое покрытие, назначение – сооружение неустановленного назначения, расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, асфальтовое покрытие возле административно-хозяйственного здания по ул. Урицкого, 19В.

Начальная цена предмета торгов – 650 000,00 бел. руб. с НДС.

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 07.10.2023 г. 09.00 по 23.10.2023 г. 16.00.

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Аэростар»

## Извещение о проведении **17 октября 2023 года** открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «Аэростар»

| |
|---|
| Предмет торгов № 1: Устройство транспортерное |
| Начальная цена: 10 159,62 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 1 693,27 руб.) |
| Сумма задатка: 507 руб. |
| Шаг аукциона: 300 руб. |
| Предмет торгов № 2: Шкаф сушильный промышленный |
| Начальная цена: 2 539,93 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 423,33 руб.) |
| Сумма задатка: 127 руб. |
| Шаг аукциона: 80 руб. |
| Предмет торгов № 3: Котел для варки |
| Начальная цена: 33 862,43 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 5 643,74 руб.) |
| Сумма задатка: 1 693 руб. |
| Шаг аукциона: 780 руб. |
| Предмет торгов № 4: Котел для разваривания с нагревом |
| Начальная цена: 33 862,43 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 5 643,74 руб.) |
| Сумма задатка: 1 693 руб. |
| Шаг аукциона: 780 руб. |
| Предмет торгов № 5: Сатуратор УНА-6 |
| Начальная цена: 12 241,82 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 2 040,31 руб.) |
| Сумма задатка: 612 руб. |
| Шаг аукциона: 350 руб. |
| Предмет торгов № 6: Машина укупорочная |
| Начальная цена: 17 257,15 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 2 876,20 руб.) |
| Сумма задатка: 862 руб. |
| Шаг аукциона: 450 руб. |
| Предмет торгов № 7: Машина этикетировочная |
| Начальная цена: 2 971,43 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 495,24 руб.) |
| Сумма задатка: 148 руб. |
| Шаг аукциона: 90 руб. |
| Предмет торгов № 8: Разливочная машина |
| Начальная цена: 10 857,15 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 1 809,53руб.) |
| Сумма задатка: 542 руб. |
| Шаг аукциона: 280 руб. |
| Предмет торгов № 9: Лосьон антибактериальный для рук «Антиковид», 5 л в количестве 1079 бутылок |
| Начальная цена: 2 857,15 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 476,20 руб.) |
| Сумма задатка: 142 руб. |
| Шаг аукциона: 90 руб. |
| Предмет торгов № 10: Лосьон антибактериальный для рук «Антиковид», 1 л в количестве 5991 бутылка, |
| Начальная цена: 4 457,15 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 742,86 руб.) |
| Сумма задатка: 222 руб. |
| Шаг аукциона: 140 руб. |
| Предмет торгов № 11: Гель антибактериальный для рук «Корона» 0,1 л количестве 6593 бутылки |
| Начальная цена: 1 714,29 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 285,72 руб.) |
| Сумма задатка: 85 руб. |
| Шаг аукциона: 50 руб. |

**Местонахождение:**

территория ОАО «МПКО», район агрогородка Гатово, Минский район, Минская область.

**Продавец имущества:** Общество с ограниченной ответственностью «Аэростар» (Адрес: 220116, г. Минск, а/я 49).

**Организатор торгов:** Общество с ограниченной ответственностью «Аэростар» (Адрес: 220116, г. Минск, а/я 49).

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает стоимость приобретенного имущества в течение пяти банковских дней с момента подписания договора купли-продажи имущества.

Договор купли-продажи имущества заключается не позднее следующего рабочего дня после проведения аукциона.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток (задатки) по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на счет ООО «Аэростар» не позднее 13 октября 2023 г. на расчетный счет № BY08OLMP30120000960060000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, получатель — ООО «Аэростар», УНП 100375899.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи имущества заключается с победителем торгов не позднее следующего рабочего дня после проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в течение пяти дней после подписания договора купли-продажи.

Торги проводятся **17 октября 2023 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Машиностроителей, дом 24а, помещение 1а, каб. 13. **Прием документов с 07.10.2023 по 13.10.2023 включительно.** Консультации по вопросам участия в торгах и по вопросу ознакомления с продаваемым имуществом осуществляются в рабочие дни с 11.00 до 13.00 и с 15.00 до 17.00 по телефону: +375296200205.

# ЗША НАКРЫЎ «ЗОМБІ-АПАКАЛІПСІС»

## Чаму Штаты захліснула фентанілавая эпідэмія?

**Навукоўцы ў ЗША б'юць трывогу з-за шалёнага росту колькасці смерцяў ад перадазіроўкі наркотыкаў. Большую іх частку звязваюць з фентанілам — сінтэтычным рэчывам, якое ў 50 разоў больш магутнае, чым гераін. Спецыялісты называюць крызіс, які разгортваецца з неверагоднай хуткасцю, чацвёртай хваляй апіёіднай эпідэміі, паведаміла «Бі-бі-сі». Яна закранула самыя розныя пласты грамадства ва ўсіх кутках краіны. Як лічаць эксперты, маштабы праблемы могуць стаць пагрозай нумар адзін для аховы здароўя і нацыянальнай бяспекі краіны. Чаму Злучаныя Штаты захліснула смяротная фентанілавая эпідэмія?**

### Беспрэцэдэнтны перадоз

На вуліцах многіх амерыканскіх гарадоў усё часцей можна сустрэць людзей, якія ляжаць у неверагодных позах і на першы погляд больш нагадваюць зомбі з фільмаў жахаў. Пры набліжэнні становіцца зразумела, што гэта чарговы выпадак з тымі, хто трапіў у залежнасць ад фентанілу. Перадазіроўкі гэтым рэчывам застаюцца самай распаўсюджанай прычынай гібелі амерыканцаў ва ўзросце ад 18 да 49 гадоў.

У 2021-м ЗША дасягнулі змрочнай мяжы: тады ўпершыню за адзін год ад перадазіроўкі наркотыкаў загінулі больш за 100 тысяч чалавек па ўсёй краіне. З гэтых смерцяў амаль 70 працэнтаў былі звязаны з сінтэтычным апіёідам фентанілам, які выклікае найбольш моцную залежнасць. Паводле інфармацыі федэральнага Цэнтра па кантролі і прафілактыцы захворванняў ЗША (CDC), у мінулым годзе ад перадазіроўкі наркотыку ў краіне загінулі ўжо 110 тысяч чалавек.

Беспрэцэдэнтная колькасць такіх выпадкаў прывяла і да зніжэння чаканай працягласці жыцця ў ЗША — упершыню з Другой сусветнай вайны. Летась у снежні гэты паказчык знізіўся да рэкордна нізкай за 20 гадоў адзнакі — 76,4 года. А доля смяротных зыходаў сярод юных амерыканцаў ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў стала ўдвая вышэйшай, чым у іх аднагодкаў з Францыі, Германіі, Японіі і іншых развітых краін. «Тое, што ў такой багатай краіне, як наша, зніжаецца працягласць жыцця, проста не падаецца правільным, — адзначыў кіраўнік аддзела статыстыкі CDC Роберт Андэрсан. — Калі паглядзець на іншыя заможныя дзяржавы свету, то ў іх не назіраецца нічога падобнага».

Паводле даных амерыканскага ўпраўлення па барацьбе з наркотыкамі (DEA), большая частка нелегальнага фентанілу, які трапляе ў ЗША, увозіцца з Мексікі. Менавіта за кошт гэтага колькасць памерлых ад перадазіроўкі наркотыкаў у ЗША за дзесяць гадоў больш чым падвоілася. Так лічаць навукоўцы з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Лос-Анджэлесе (UCLA), якія вывучылі дынаміку смяротнасці ад гэтых прычын. Іх аналіз быў заснаваны на даных аб перадазіроўках, сабраных за 2010—2021 гады цэнтрамі ЗША па кантролі і прафілактыцы захворванняў (ведамствам пры амерыканскім Міністэрстве аховы здароўя). «Рост незаконнай вытворчасці фентанілу прывёў у Злучаных Штатах да крызісу перадазіровак беспрэцэдэнтнага маштабу», — пішуць аўтары даследавання.

У 2010 годзе ад атручвання наркотыкамі па ўсёй краіне памерла менш за 40 тысяч чалавек, і менш за 10 працэнтаў гэтых смерцяў тады былі звязаны з фентанілам.

У той час вялікая частка памерлых ужывала гераін або апіёіды, што адпускаюцца па рэцэпце. Але ўжо да 2015-га, як сведчыць даследаванне экспертаў UCLA, становіцца прыкметным рост смяротнасці, звязанай менавіта з фентанілам. Ён распаўсюджваўся па краіне, рэзка павялічваючы колькасць і змяняючы прычыны перадазіровак наркотыкамі ад Гаваяў да Аляскі і Род-Айленда. «Папулярнасць» фентанілу ўзляцела і таму, што ён выклікае моцную залежнасць — людзі сталі купляць яго зноў і зноў, каб пазбегнуць балючай ломкі.

### Поўны «транк»

Нават невялікая колькасць прэпарату, які трапіў у чалавечы арганізм, можа выклікаць перадазіроўку і смерць. Яго сістэматычнае выкарыстанне ў камбінацыі з іншымі рэчывамі, напрыклад з седатыўным прэпаратам ксілазінам (ужываецца ў ветэрынарыі), які вулічныя гандляры наркотыкамі часцей за ўсё падмешваюць пакупнікам фентанілу для большага эфекту, выклікае гніенне скуры і цягліц і іх наступнае адміранне — адсюль і мянушка прэпарата — «зомбі-наркотык». Ён таксама вядомы пад назвай «транк» (скарочанае ад «транквілізатар»). Амерыку захліснула цунамі новага «зомбі-наркотыку», піша ў сувязі з гэтым у сваім тэлеграм-канале палітолаг-амерыканіст Малек Дудакаў. «Менавіта гэтае рэчыва і ператварыла вуліцы амерыканскіх мегаполісаў у сапраўдны «зомбілэнд». Прычым папулярнасць новага наркотыку, які ператварае людзей у гародніну і забівае за паўгода, расце рэзкімі тэмпамі, — заўважае Дудакаў. — Сярод усіх станоўчых тэстаў на наркотыкі ў Штатах, дзе быў знойдзены фенталіл, ужо ў 16 працэнтах выпадкаў фігуруе «транк». А ў асобных штатах накшталт Пенсільваніі або Агаё яго доля дасягае 40 працэнтаў».

«Замбіраваныя» спажыўцы фентанілу і «транку» ляжаць на заваленных іголкамі вуліцах ад Вашынгтона да Масачусэтса, ад Луізіяны да Філадэльфіі. Людзі, без усялякага сораму, тыя, хто паляць або нюхаюць наркотыкі, сустракаюцца нават на лужках побач з адным з прэстыжных устаноў краіны — Ельскім універсітэтам, звяртае ўвагу Daily Mail. Штат Вашынгтон займае трэцяе месца ў ЗША па спажыванні наркотыкаў. Толькі ў 2021 годзе колькасць смерцяў, звязаных з забароненымі рэчывамі, пераваліла ў рэгіёне за дзве тысячы. І, як відаць, сітуацыя тут працягвае выходзіць з-пад кантролю. «Вы можаце праехаць па вуліцы і ўбачыць каго-небудзь, хто, відавочна, толькі што прыняў фентанілу, ледзь стаіць на нагах, згінаецца і выглядае так, быццам вось-вось упадзе без прытомнасці, — расказвае камандзір заходняга ўчастка паліцэйскага ўпраўлення Сіэтла Стыў Стрэнд. — І калі вы вяртаецеся праз 15 хвілін, то гэты чалавек ужо ўстае і ходзіць, як быццам нічога не адбылося, пасля чаго пачынае шукаць новую дозу».

Улады Вашынгтона зрабілі жахлівую заяву: у мясцовых моргах і крэматорыях скончылася свабоднае месца. Па словах афіцыйных асоб з упраўлення судова-медыцынскай экспертызы акругі Кінг, дэпартамент з цяжкасцю спраўляецца з паступленнем вялікай колькасці цел на фоне абвастрэння фентанілавага крызісу. У 2021 годзе суды Сіэтла адмянілі закон, згодна з якім захоўванне моцнадзейных наркотыкаў, уключаючы какаін, метамфетамін і гераін, было крымінальным злачынствам. На думку экспертаў, менавіта змякчэнне пакарання стала галоўнай прычынай бягучых праблем. Між тым Філадэльфія стала эпіцэнтрам распаўсюджвання таннага і моцнадзейнага «транку». Гэта атрутнае рэчыва, якое выклікае ў людзей праблемы з дыханнем, «ператварае спажыўцоў у «зомбі», якія блукаюць па вуліцах». На шакавальных здымках, атрыманых Daily Mail у «горадзе братэрскай любові», можна ўбачыць, як людзі ляжаць, распластаўшыся на зямлі, у стане, падобным на транс. Многія наркаманы адкрыта колюцца ў шыю на лаўках каля парку Макферсан-сквер, які мясцовыя жыхары з жахам называюць «паркам іголак».

У раёне Кенсінгтон таксама ўтварыліся так званыя лагеры зомбі. Групы наркаманаў кучкуюцца сярод дзіўнай мэблі, палатак і імправізаваных вогнішчаў, сядзяць і па чарзе робяць ін'екцыі «транку» дзеля «фатальнага кайфу».

### Праблема на трыльён долараў

Паводле самых прыблізных ацэнак, амерыканскія грамадзяне з'яўляюцца цяпер спажыўцамі больш за 80 працэнтаў ад сусветнага аб'ёму апіёідаў. Упраўленне дзяржаўнай палітыкі адміністрацыі прэзідэнта ЗША ў сферы кантролю за наркотыкамі ўжо каторы год сігналізуе аб апіёіднай эпідэміі, здольнай у хуткім часе стаць для амерыканскай нацыі пагрозай нумар адзін. Асноўная небяспека, на думку членаў камісіі, хаваецца ў сістэме аховы здароўя краіны, якая дазваляе свабодна ўжываць моцныя анальгетыкі, здольныя выклікаць прывыканне. Прыхільнасць да наркотыку, па сведчанні экспертаў, з'яўляецца вынікам прывыкання да моцнадзейных абязбольвальных прэпаратаў, якія з лёгкасцю выпісваюць сваім пацыентам нізкакваліфікаваныя амерыканскія ўрачы. Замест таго, каб крыху прыглушыць боль, медыкі аддаюць перавагу таму, каб зняць яе цалкам, ствараючы тым самым рызыку ўзнікнення залежнасці ад магутных, але даступных абязбольвальных сродкаў. Акрамя таго сістэма ацэнкі бальніц у ЗША шмат у чым грунтуецца на водгуках пацыентаў, якія, у сваю чаргу, ацэньваюць урачоў па ступені бязбольнасці лячэння. Адсюль і лёгкасць, з якой прызначаюцца і прымаюцца моцныя анальгетыкі-апіёіды.

Пры гэтым значная частка залежных ад фентанілу прызнаецца, што рэгулярнаму ўжыванню наркотыку папярэднічала прыхільнасць да рэцэптурных апіёідаў. Спробы ўлад спыніць смяротны ланцужок пры дапамозе выпуску клінічных кіраўніцтваў, згодна з якімі хранічная боль здымаецца ў першую чаргу за кошт неапіёідных прэпаратаў, прынеслі свае вынікі. Аднак гэтыя меры сустрэлі магутны супраціў з боку фармацэўтычных лобі.

Менавіта пры адміністрацыі Джо Байдэна колькасць смерцяў ад перадазіроўкі наркотыку выраслa ў разы. Асаблівую трывогу амерыканскіх улад выклікае тое, што ахвярамі наркотыку ўсё часцей становяцца менавіта падлеткі. А таксама і зусім маленькія дзеці, прычым нярэдка па віне ўласных бацькоў, якія ўжываюць фентаніл і пакідаюць наркотык у даступным месцы. Загінулыя дзеці, некаторым з якіх не было і двух гадоў, выпадкова ўдыхалі або цягнулі ў рот ці вочы небяспечны парашок — нават мінімальная доза гэтага наймацнейшага наркотыку аказвалася для іх несумяшчальнай з жыццём. «Я працую пракурорам ужо 25 гадоў і не магу згадаць ніводнага іншага наркотыку, які прывёў бы да такой колькасці разбурэнняў і смяротных зыходаў», — адзначыў Дайма Калхун, намеснік акруговага пракурора акругі Рывэрсайд, штат Каліфорнія.

«Кожная сям'я ў Амерыцы, незалежна ад яе паходжання або перакананняў, у той ці іншай ступені сутыкнулася з праблемай нарказалежнасці. Такая рэальнасць, — лічыць дырэктар упраўлення дзяржаўнай палітыкі адміністрацыі прэзідэнта ЗША ў сферы кантролю за наркотыкамі Рахул Гупта. — Эпідэмія нанесла зруйнавальную шкоду грамадскай ахове здароўя і эканоміцы. Залежнасць перашкаджае камусьці цалкам раскрыць свой патэнцыял і ўнесці прадукцыйны ўклад у жыццё сваёй сям'і ці супольнасці. Папярэднія даследаванні паказалі, што эканамічныя выдаткі эпідэміі складаюць прыкладна трыльён долараў за год. Калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, наша нацыянальная бяспека і росквіт у доўгатэрміновай перспектыве могуць быць сур'ёзна падарваныя».

Як лічыць палітолаг-амерыканіст Малек Дудакаў, «дэмакраты ў сваіх мегаполісах ужо на ўсю моц спрабуюць самі ўзначаліць наркатычнае «цунамі» — адкрываючы пункты бясплатнай раздачы шпрыцаў і «бяспечных» доз апіятаў. Бо чым больш амерыканцаў адправіць у наркатычны угар, тым менш будзе тых, хто задае нязручныя пытанні аб стане ЗША, якія працягваюць стабільна ісці ўразнос у сувязі з усімі крызісамі». «Зомбі-апакаліпсіс» працягваецца...

**Захар БУРАК.**

# ФУНДАМЕНТ ДЛЯ ЎСЯГО І ДЛЯ КОЖНАГА

***З прафесійным святам работнікаў культуры павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка:***

*«Дзякуючы шматграннаму таленту, мудрасці і нястомнай працы многіх пакаленняў творчых работнікаў умацоўваецца народнае адзінства, — гаворыцца ў віншаванні. — Сфера культуры з'яўляецца скарбонкай матэрыяльнай і духоўнай спадчыны краіны і найважнейшай крыніцай фарміравання беларускай дзяржаўнасці. На працягу стагоддзяў выступае аб'яднальным фактарам для грамадства, надзейным бар'ерам і ментальным імунітэтам ад уплыву непрымальнага светапогляду. Упэўнены, што і надалей вы будзеце натхнёна памнажаць багацце нацыянальнага мастацтва, выхоўваць на традыцыйных каштоўнасцях маладое пакаленне і абуджаць гонар за Радзіму».*

Сістэма Міністэрства культуры сёння налічвае 28 тэатраў, 21 канцэртную арганізацыю і 2 цыркі. За студзень–жнівень бягучага года тэатрамі краіны праведзена 6532 паказы спектакляў. І колькасць іх наведванняў склала 1 123 837 чалавек. Канцэртнымі арганізацыямі і цыркамі праведзена 3899 паказаў канцэртаў і прадстаўленняў, якія ўбачыла 1 884 994 чалавекі. Напярэдадні Дня работнікаў культуры прадстаўнікі Міністэрства культуры і шэрагу культурных арганізацый сустрэліся, каб ацаніць прамежкавыя вынікі ў прафесійнай сферы і падзяліцца планамі і поглядамі на актуальныя пытанні.

— Сёння ў сферы культуры фукцыянуе 1045 дзяржаўных арганізацый культуры з правамі юрыдычных асоб, у тым ліку 34 арганізацыі рэспубліканскай формы ўласнасці. А з улікам адасобленых структурных падраздзяленняў і філіялаў маем 5687 арганізацый. Дзяржаўная кадравая палітыка ў сферы культуры накіравана на камплектаванне арганізацый культуры кваліфікаванымі спецыялістамі, амаладжэнне кадравага складу, фарміраванне дзейнага рэзерву кадраў, забеспячэнне кадравай бяспекі і стварэнне спрыяльнага маральнага, псіхалагічнага клімату ў калектывах, — адзначыў **начальнік упраўлення прафесіянальнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Раман МАМЧАНКА**. — Забяспечанасць кадрамі арганізацый у сферы культуры з 2020 года захоўваецца на ўзроўні 96 %. Запаўненне вакансій здзяйсняецца і маладымі спецыялістамі. За апошнія тры гады ў арганізацыі культуры прыбыло па размеркаванні больш за 3000 выпускнікоў устаноў адукацыі. Дзяржаўная палітыка падтрымкі нацыянальнай культуры захавала сваю сацыяльную накіраванасць, сацыяльны стандарт выдаткаў на культуру за кошт бюджэтнага фінансавання з разліку на аднаго жыхара ў сярэднім па краіне 2,1 базавай велічыні. Прагноз на 2023 год, што гэтая лічба складзе 2,3 базавай велічыні. Адной з асноўных задач з'яўляецца павышэнне заработнай платы, таму ў адпаведнасці з Праграмай дзейнасці ўраду Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2025 года здзяйсняецца паэтапнае павышэнне памеру аплаты працы работнікаў сферы культуры. У тым ліку і за кошт увядзення новай стымуляцыйнай выплаты.

Не абмінуў прадстаўнік міністэрства і пытанні прававога рэгулявання сферы культуры. У ліпені 2022 года прыняты Закон Рэспублікі Беларусь, у якім унесены дапаўненні ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. У асноўным змены закранулі пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны, вываз культурных каштоўнасцяў, правядзення культурных мерапрыемстваў. Таксама, прымаючы да ўвагі развіццё інфармацыйных тэхналогій і актуалізаваныя нормы кодэкса, якія рэгламентуюць дзейнасць бібліятэк, музеяў, клубаў, уведзена паняцце аддаленага карыстальніка, замацоўваецца магчымасць арганізацыі дзейнасці клубаў праз інтэрнэт. З 1 жніўня 2022 года ў краіне вядзецца рэестр арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў, куды ўключаюцца арганізатары з ліку юрыдычных асоб прыватных форм маёмасці і індывідуальных прадпрымальнікаў. У снежні 2022 года была завершана работа па абнаўленні актаў кіраўніка дзяржавы, якія стасуюцца дзейнасці спецыяльных фондаў Прэзідэнта РБ. А з 1 студзеня 2023 года выдаецца гастрольнае пасведчанне для правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў.

Што датычыцца пытання павышэння запаўняльнасці залаў і прыцягнення дадатковых гледачоў, здзяйсняецца тое за кошт актыўнага пракату прэм'ерных і папулярных спектакляў. Так, у чацвёртым квартале 2023 года і ў 2024 годзе нас чакае каля 200 прэм'ерных спектакляў і канцэртных праграм, прадстаўленняў. Адзначаецца таксама рост гастрольных мерапрыемстваў. Напрыклад, за студзень — жнівень бягучага года праведзена 2191 такое мерапрыемства, прычым больш за 400 з іх за мяжой. Беларускія калектывы выязджалі ў РФ, у Кітай, Казахстан, Узбекістан, Францыю, Германію, Аўстрыю, ААЭ, Польшчу, В'етнам.

У сваю чаргу, **Генадзь ХОДАР, кансультант аддзела аховы і ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**, больш падрабязна спыніўся на тэме захавання дзяржавай культурнай спадчыны.

— Не ведаючы мінулага, мы і не маем будучыні. Нашы ўнікальныя аб'екты — гарадзішчы, замкі, сядзібы, цэрквы — адкрываюць перад намі шматвяковую гісторыю беларускай дзяржаўнасці. На сёння ў нашай краіне ўлік аб'ектаў, якія ахоўваюцца дзяржавай, вядзецца ў выглядзе такога дакумента, як Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, куды ўнесены 5671 аб'ект, — кажа Генадзь Ходар. — У 2023 годзе ў заканадаўстве аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны таксама адбылося паляпшэнне некаторых норм, якія дазваляюць спрашчаць работы на гісторыка-культурных каштоўнасцях. Адным з такіх наваўвядзенняў, напрыклад, з'яўляецца перадача паўнамоцтваў па ўзгадненні работ на аб'ектах трэцяй катэгорыі на мясцовыя выканаўчыя органы абласнога ўзроўню. Такіх аб'ектаў у нас амаль 87 % ад агульнай колькасці гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Дадзеная працэдура дазваляе па адной заяўцы Міністэрству культуры праводзіць патрэбныя работы. І гэтая норма, як мы бачым на практыцы справаздачнага перыяду, вельмі актывізавала тыя работы, якія не патрабуюць распрацоўкі дарагой праектнай дакументацыі. Сёлета ўведзена ў эксплуатацыю 38 помнікаў архітэктуры. Сярод найбольш значымых аб'ектаў можна назваць палацава-паркавы комплекс у Свяцку Гродзенскага раёна, палац Булгакаў у Жылічах, Любавіцкую сінагогу ў Віцебску і іншыя аб'екты.

Таксама спецыяліст распавёў пра такое наваўвядзенне ў законе аб культуры, як паняцце «рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Яно спрыяе таму, каб у кожнай вобласці, раёне распрацавалі і зацвердзілі свой рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па ахове культурнай спадчыны. На бягучы момант у краіне, напрыклад, ёсць парадку 280 помнікаў архітэктуры, якія знаходзяцца ў нездавальняльным стане. І па кожным з гэтых аб'ектаў распрацаваны пакрокавы план мерапрыемстваў да 2025 года на ўзроўні абласканкамаў, дзе прадугледжаны мерапрыемствы па першачарговых супрацьаварыйных кансервацыйных мерапрыемствах. Летась з ліку такіх аб'ектаў 14 залучаны ў зварот. І ў планах міністэрства — што і сёлета будзе яшчэ такая ж колькасць.

— Важнае значэнне мае і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку на міжнароднай арэне. Так, усім вядомая арганізацыя ЮНЕСКА вядзе спіс важных сусветных гісторыка-культурных каштоўнасцяў, куды ўжо занесены ад нашай краіны 4 матэрыяльныя аб'екты і 5 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Летась туды было ўключана саломапляценне Беларусі. Сёлета яшчэ падаліся ў дзвюх намінацыях — «Неглюбская тэкстыльная традыцыя ў Гомельскай вобласці» і «Беларускае мастацтва выцінанкі». Апошняе, напрыклад, пастаўлена ў план на разгляд на 2024 год, — распавядае Генадзь Ходар. — Таксама ў гэтым годзе мы папоўнілі і дзяржаўны спіс 12 новымі элементамі. Адзін з іх — беларуская дуда. Адпаведна ў нашых планах — унесці ў наступным годзе культуру беларускай дуды таксама на разгляд ЮНЕСКА для ўключэння яе ў спіс каштоўнасцяў.

**Алена ДРАПКО.**

Сувязі

# КУЛЬТУРА – АСНОВА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

**З 4 да 7 кастрычніка праз Беларусь праходзіць місіянерскі хрэсны ход з копіяй Гадзенаўскага крыжа, прысвечаны 600-годдзю з'яўлення святыні. Праводзяцца гутаркі, сустрэчы са студэнтамі духоўных і свецкіх ВНУ, кінапаказы, круглыя сталы, у якіх бяруць удзел дзеячы культуры і мастацтва.**

У Мінску круглы стол «Традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці ў культуры Беларусі і Расіі як аснова фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці, выхавання асобы і патрыятызму» прайшоў у Храме-помніку ў гонар Усіх Святых. Адзін з удзельнікаў місіянерскага хрэснага ходу — народны артыст РФ, член Патрыяршага Савета па культуры Мікалай Бурляеў — падчас сустрэчы заўважыў, што сёння вядзецца барацьба за душы, а культура з'яўляецца асновай нацыянальнай бяспекі.

— Мы змагаемся за стварэнне новай цывілізацыі, прасветленай,

гарманічнай, якая не здрадзіла хрысціянскім каштоўнасцям, — адзначыў Мікалай Бурляеў. Удзельнікам круглага стала ён прадставіў свой новы фільм. Дакументальная стужка «Божа, адчуваю прыбліжэнне Тваё!» з'яўляецца ключом да разумення творчасці знакамітага рэжысёра Андрэя Таркоўскага.

Удзельнікі круглага стала падзяліліся асцярогай за лёс падрастаючага пакалення. Член Камісіі Парламенцкага сходу па культуры, навуцы і адукацыі Ганна Старавойтава гаварыла пра дэфіцыт увагі, якую павінны атрымліваць дзеці. Кіраўніцтвам краіны робіцца вельмі многа, каб стварыць умовы, якія падтрымаюць сям'ю. Можна згадаць, напрыклад, пра той жа мацярынскі капітал. Але сёння мала проста выкарыстоўваць фінансавыя рычагі, важна больш увагі аддаваць сацыякультурным фактарам, культуры і рэлігіі, захаванню каштоўнасцяў і фарміраванню светапоглядных установак. Прычым, як заўважыў намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па Культуры, навуцы і адукацыі Анатоль Шчасны, пачынаць такую работу неабходна з грамадзянамі самага юнага ўзросту, тады для малых і сямейных каштоўнасці, і духоўныя і патрыятычныя аспекты будуць натуральнымі і зразумелымі. Старшыня Савета Мінскай епархіі па культуры протаіярэй Іаан Задарожын распавёў, якую работу ў гэтым кірунку праводзіць праваслаўная царква:

— Павінна весціся пастаянная работа для таго, каб перафарматаваць моладзь. Мастацтва, жывапіс, музыка маюць наймагутнейшы ўплыў на чалавека. Безумоўна, не абысціся без цэнзуры. У той жа час моладзі трэба даваць свабоду праяўлятца творча, і мы адкрыты для дыялогу і новых праектаў.

Але ці трэба гнацца за інавацыямі? На гэта пытанне звярнуў увагу старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. Заўважана, што новыя тэхналогіі вядуць да страты традыцыйных форм у культуры. Сучасная моладзь перастала чытаць. Але гэта не азначае, што цяпер трэба адмовіцца ад папяровай кнігі, наадварот, важна захаваць яе як праваднік каштоўнасцяў, мастацкага слова. На жаль, доўгі час не звярталася ўвага, як традыцыйныя формы разбураліся ў розных галінах мастацтва — кінематографе, тэатры, жывапісе, літаратуры. А гэта несла пагрозу і для дзяржавы, нашай культуры і ладу жыцця. Важна дзяліцца інфармацыяй пра генацыд у гады Вялікай Айчыннай вайны і пра подзвігі, якія здзяйснялі на нашай зямлі людзі розных нацыянальнасцяў.

Пра тое, якія захады робяцца ў Беларусі ў кірунку гістарычнай палітыкі, распавёў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін. Што гэта праца носіць сістэмны характар, сведчаць назвы гадоў. Так, Год народнага адзінства суправаджаўся ўсплёскам грамадзянскай актыўнасці, у краіне пачаў адзначацца Дзень народнага адзінства. У Год гістарычнай памяці было прынята рашэнне прыбраць на вуліцах надпісы на лацініцы. Распрацаваны курс «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці», вядуцца работы па папулярызацыі гісторыі, праводзяцца актуальныя гістарычныя даследаванні.

**Ганна ПЯТРОВА.**

**Станіслаў ТРЫФАНАЎ**:

# «ЧАКАННІ АД ЦЯБЕ Ў ПУБЛІКІ ЎЖО ІНШЫЯ»

**Першы раз у якасці народнага артыста Беларусі саліст оперы Станіслаў ТРЫФАНАЎ выйшаў на сцэну ў канцэрце да Дня незалежнасці, які праходзіў у Вялікім тэатры пры перапоўненай зале. Затым яго барытон прагучаў на «Славянскім базары ў Віцебску» падчас выканання «Набату» — увесь амфітэатр устаў на першых жа гуках. Сваю частку гарачых віншаванняў ад публікі артыст адчуў у даволі пафаснай, але працоўнай атмасферы. І сцвярджае, што самае прыемнае ў працы — гэта яна сама, таму што дае магчымасць рэалізавацца:**

— Што да оперы, то гэта, вядома, не проста праца, а праца штодзённая. І кожны раз, калі выходзіш на сцэну (спачатку як саліст другой катэгорыі, пасля майстар сцэны, заслужаны артыст ці ўжо як народны), спрабуеш паказаць найлепшае, што можаш сёння. Паіншаму ў тэатры не бывае. Вядома, высокае званне — гэта веха, пэўнае дасягненне. Але яно за цябе працаваць не будзе, яго трэба пацвярджаць, бо чаканні ад цябе ў публікі ўжо іншыя.

***— Ёсць спектаклі, на якія гледачы ходзяць паслухаць вас. Не заўсёды супадае тое, што любіць публіка і што здаецца выйгрышным і любімым артыстам.***

— Я б сказаў, што ёсць спектаклі больш любімыя, але ў той жа час яны могуць быць і нязручнымі. Гэта розныя рэчы. Дапусцім, я вельмі люблю «Макбет», але гэта складаны спектакль, у ім цяжка працаваць. Можна казаць пра любімыя і лёгкія, якія з вакальнага пункту гледжання мне даюцца прасцей, дапусцім, чым «Лятучы галандзец»...

***— Але гэта адзін з тых спектакляў, якія публіка любіць шмат у чым дзякуючы вам.***

— Мусіць... Калі даеш згоду і ідзеш на гэтую авантуру — рыхтаваць ролю, — то ўсё роўна думаеш аб тым, наколькі гэта трапляе ў твае эмацыянальна-псіхалагічныя даныя, каб забяспечыць якаснае выкананне. Калі мяне Бог узнагародзіў тэмпераментам, фактурай, якія прапісаны, дапусцім, у партыі Гразнога ў «Царскай нявесце», то грэх гэта не выкарыстаць. І калі я разумею, што мой тэмперамент і вакальныя даныя блізкія гэтаму вобразу, то з большай ахвотай выконваю партыю. Але і ісці папярок сваім здольнасцям таксама цікава як артысту. Дапусцім, знаходзіць у сабе нейкія праявы для партыі Анегіна. Я зусім не франт па натуры, але даводзілася і спінку трымаць у гэтым спектаклі, а гэта для мяне даволі цяжка. Цікава рабіць і тое, што табе пасуе, і тое, што табе не пасуе. Іншая справа, што публіка, напэўна, хоча бачыць ад мяне больш рамантычнай оперы і эмацыянальнага героя, такога, каб наводмаш... Дарэчы, менавіта дзякуючы спектаклям «Лятучы галандзец» і «Царская нявеста» я атрымаў узнагароды за найлепшыя акцёрскія работы года. Гэта цяжкія для працы спектаклі, але для публікі цікавыя. Кожны раз, выходзячы на сцэну ў гэтых вобразах, я разумею, што будзе няпроста. Але ў гэтых спектаклях сышліся музыка і складаная драматургія.

***— Опера — мастацтва, дзе першапачаткова ўсё вырашаў голас, але сёння больш увагі ўдзяляецца менавіта драматургічнай, пастановачнай частцы. Як вы працуеце над сабой, каб сумяшчаць каласальную вакальную нагрузку з акцёрскай?***

— Цяпер драматычны тэатр моцна пранікае ў оперу. І гэта я кажу пра тэндэнцыю, якая ўзнікла ў пасляваенны час. Хаця навацыры былі і да рэвалюцыі, яшчэ ў час Шаляпіна. Але патрабаванні да спевакоў яшчэ і як да драматычных артыстаў узраслі істотна з 80—90-х гадоў мінулага стагоддзя. Праспяваць ноты, напэўна, не так складана: мы ж прафесійныя спевакі, атрымліваем адпаведную адукацыю. Ты прыходзіш у тэатр недзе на пятым курсе ці пасля аспірантуры. Як у характарыстыках пішуць: голас высакароднага тэмбру поўнага дыяпазону. Вось чалавек — калі ласка, рабіце з яго спевака! Але ў сённяшнім тэатры гэтага мала, таму што калі вы проста добра праспяваеце, публіку гэта не задаволіць, неабходна эмацыянальнае ўздзеянне. А гэта ўжо драматычнае і акцёрскае майстэрства. І выдаткі энергіі іншыя. Ну і рэжысёры таксама прыдумляюць сцэнічныя разнастайныя хады, даволі каверзныя для артыстаў, якія павінны і скакаць, а могуць нават узлятаць. Гэта, натуральна, не на карысць вакалу, таму што оперныя спевы — гэта найперш дыханне. Калі яно збіваецца, то гэта не ўпрыгожвае выкананне. Сённяшні оперны тэатр іншы, можа быць, на жаль, а можа быць, на шчасце. Таму мы таксама ўжо адчуваем сябе не толькі спевакамі, якія выдаюць гукі, не толькі музыкантамі, але яшчэ і акцёрамі. А цяпер магчымыя самыя складаныя рэжысёрскія прачытанні і прыёмы, прымяняюцца інсталяцыі, відэа і іншыя тэхнічныя магчымасці. Карацей, бедны глядач, трымайся!..

***— Аднак усе пры гэтым ходзяць у оперу на артыстаў, на голас.***

— Тут мы вяртаемся да першакрыніцы. Людзі ж заўсёды рэагуюць на голас: прыемны, непрыемны. І спеўны голас кранае і адлюстроўвае нейкія пласты на ментальным узроўні. Таму што сапраўды можна атрымаць задавальненне — гэта прыгожа! Спевы — гэта адзін з найстаражытнейшых відаў мастацтва, наўрад ці мы можам ведаць яго дакладны ўзрост.

***— Як з гэтым інструментам жыць, каб падоўжыць гады творчай працы? Бо, як і любая прылада, голас мае свой запас трываласці.***

— Няма такога рэцэпту: рабі вось гэта, і будзеш спяваць 30, 40, 50 гадоў. Ёсць прыклады, калі артысты прытрымліваліся вельмі беражлівага рэжыму працы, падбіралі рэпертуар, але нешта ўсё роўна не ладзілася, з часам голас сыходзіў. Ёсць прыклады адваротныя. Я бачыў, як артысты вельмі шмат спявалі і да глыбокай сівізны заставаліся на сцэне. Але ёсць агульнапрынятыя «правілы гігіены» голасу: даваць адпачынак, не перагружаць, своечасова пераходзіць ад лірычнага рэпертуару да драматычнага. Не спяваць не свой рэпертуар. Адмаўляцца ад нейкіх выгадных, але траўматычных для голасу рэчаў. Трэба з халодным розумам падыходзіць да працы, што няпроста. Бо ёсць спакусы — матэрыяльныя, альбо прапануюць шыкоўную партыю. А яна для цябе праз 10 гадоў была б добрая. Ты можаш, канечне, стрэліць, а можаш пазбавіцца голасу. А вяртаць яго вельмі цяжка. Аднавіць, перавучыць — складаны працэс, вельмі рэдка паспяховы. Я стараюся думаць, не перагружацца ў непатрэбны мне дыяпазон. Гэта ўсё роўна даводзіцца рабіць, але трэба глядзець: у галаве ідзе як быццам работа працэсара, які ўсё падлічвае. Як казаў мне мой педагог (і кажа дагэтуль): «Трэба з гарачым сэрцам і халоднай галавой падыходзіць да працы». Гэта не заўжды

атрымліваецца на сцэне. Асабліва калі эмацыянальны спектакль і цябе заносіць, даводзіцца часам і патраціцца, а голас церпіць. Што рабіць? Такі від дзейнасці. Мы працуем у тысячнай зале. Неабходна дакрычацца ў літаральным сэнсе слова — гэта энергетычныя рэчы. Як італьянцы кажуць, спевы — гэта высокаарганізаваны мастацкі крык. Ненармальны стан чалавека, калі ён спявае праз 8-метровую аркестравую яму, поўную медных духавых інструментаў, і да апошняга рада яго павінны чуць.

***— У вас ёсць запрашэнні на ўдзел у пастаноўках іншых тэатраў. Ці фільтруеце, у якім спектаклі хацелі б спяваць, а ў якім — не?***

— Хутчэй, пакідаю для сябе магчымасць удзелу. Але ў мяне дастаткова вузкае кола, з якім я супрацоўнічаю. У мяне няма агента. Для мяне дастаткова працы ў родным Вялікім тэатры Беларусі. Акрамя таго, ёсць Казанская опера, куды я шмат езджу, з імі працую шмат сезонаў. Гэта добры тэатр, для мяне ёсць праца, цікавыя пастаноўкі, дзе працуюць у лепшым сэнсе гэтага слова кансерватыўныя людзі, там асабліва «не забалуеш». І мне гэта таксама блізка і падабаецца. Я, у прынцыпе, ведаю заўсёды, чаго чакаць ад запрашэння. Калі ведаеш прозвішча рэжысёра, можна прыкладна ўявіць, што будзе ў выніку.

***— Ці ёсць мара нешта праспяваць, якая пакуль не здзейснілася?***

— У мяне няма такога. Калі пашукаць, то можна знайсці мільён няспетых партый. Палова Вердзі, але ён не вельмі мне блізкі, таму што лірычны, а я ўжо стаў спяваць больш глыбокі і ніжкі рэпертуар — рускую, нямецкую оперу. Хоць і «Сіла лёсу» Вердзі, і «Эрнані», дзе выдатная роля Дона Карласа, і «Сымон Баканегра» цікавыя. Але шмат такой музыкі, той жа «Барыс Гадуноў», які для барытона напісаны (хаця Рымскага-Корсакава я калісьці спяваў у Мінску ў канцэртнай версіі). Аднак можна атрымаць самую прыгожую ролю, самую прапісаную і жаданую, а потым нарвацца на такую пастановачную групу, якая сапсуе жыццё, і ў самым любімым спектаклі давядзецца пакутаваць, а не атрымліваць задавальненне. Цікава, калі сустракаюцца таленавітыя рэжысёры, дырыжоры, партнёры. Гэта, бадай, і ёсць творчая мара.

Мне, напрыклад, вельмі падабаецца зусім маленькая партыя Атаманшы ў оперы «Снежная каралева». З задавальненнем спяваю шасціхвілінны ўрывак. Гэта вельмі прыгожы спектакль. Ён нават не зусім дзіцячы, у ім ёсць шматслойнасць. У нашай банды разбойнікаў невялікі эпізод: яны вясёлыя і добрыя. Я ж злыдзень па вобразах, але мае злыдні ў іншых спектаклях значна больш страшныя...

Дзіцячы спектакль — «балдзёж» для артыстаў. Але я нават для кансерваторскіх тэатраў раіў бы звяртацца да дзіцячых спектакляў: яны даюць акцёрскую свабоду, можна разняволіцца, раскрыцца. Не быць прывязаным да такога бронзавага опернага героя, які навязаны стэрэатыпна. Гэта добры шлях для разняволення. І добры шлях, каб захапіць маладых гледачоў.

***— Што значыць захапіць дзяцей операй, вы ведаеце на прыкладзе сваёй сям'і?***

— Мы вырашылі, што музыка патрэбная. Старэйшая дачка ўжо вучыцца на чацвёртым курсе музычнага каледжа. Малодшы сын толькі паступіў у музычную школу, скончыўшы падрыхтоўчы клас. Ужо паспеў пазаймацца на скрыпцы і на харавым аддзяленні. Цяпер вызначыўся: ён у нас піяніст. Я не хацеў бы прымушаць, але атрымаць пачатковую музычную адукацыю павінен кожны чалавек, як я думаю, бо сам яе не атрымаў. Вельмі шкадую, што ў свой час выплакаў сабе свабоду і ў выніку не валодаю ніякім музычным інструментам...

***— Ну, у оперу ж прыходзілі нават самародкі...***

— Цяжка так сказаць пра мяне, таму што мама і тата дырыжоры. Але сапраўды музыкальнасць не схаваеш. Я не атрымаў пачатковай музычнай адукацыі, таму мне падаецца, што дзецям трэба абавязкова прывіваць любоў да музыкі. Раней хор быў у кожнай школе, а цяпер такога няма. Дзеці павінны спяваць у хоры, гэта калектыўная творчасць, гэта знаёмства з музыкай. І менавіта ў шэсць-сем гадоў, пакуль яны яшчэ ў ТікТок не ўлезлі. Музыка ж мяняе людзей. Гэта будзе як адкладзены эфект, але вырастуць людзі, якія па-іншаму ставяцца да чалавека, да свету і працэсаў, што ў ім адбываюцца.

***— Ці дапамагае тое, што вы з жонкай абодва спяваеце ў тэатры?***

— У нашым выпадку дапамагае. Магчыма, у большасці сямейных пар вакалістаў адбываецца ўзаемапранікненне ў творчасць адзін аднаго. Атрымалася так, што мы з Дзіначкай з першага курса разам працавалі, разам рабілі ўрыўкі. Ездзілі да майго педагога займацца. Гэта значыць, мы існуём у адной вакальнай веры. У нас адны і тыя ж любімыя спевакі, мы аднолькава адчуваем свет тэатра. Таму і Дзіначка са мной раіцца, і я — з ёй. Калі цябе слухаюць збоку, то гэта крыху іншае ўспрыманне, чым калі выканаўца чуе сябе сам. Але дома мы ніколі не спяваем разам. І стараемся не працаваць разам. Я нервуюся вельмі моцна, калі мы разам на сцэне — не за сябе, а за жонку. І таму папрасіў, каб нас не ставілі ў адзін спектакль. Але бываюць асобныя моманты, калі мы разам на сцэне, як правіла, гэта невялікія ўрыўкі. Калі залішне шмат увагі аддаеш блізкаму чалавеку, то губляеш над сабой кантроль, а гэта нядобра. А збоку паслухаць адзін аднаго — гэта добра і карысна.

***— Многія оперныя зоркі набывалі сапраўды народную любоў, калі пачынялі спяваць папулярныя песні. Вы для сябе дапускаеце такую перспектыву?***

— ...Ніколі не кажы «ніколі». Справа ў тым, што песні розныя. Ёсць такія, для якіх, каб праспяваць, неабходна мастацтва валодання голасам. Той жа Магамаеў і іншыя, хто ў гэтым жанры працаваў, выдатна валодалі вакалам. Песні былі адпаведныя іх дыяпазону, даволі складаныя. Ёсць думкі зрабіць праграму з любімых песень. Мы часам атрымліваем задавальненне, спяваючы любімыя песні нашых бацькоў і дзядоў у вялікіх канцэртах, — тады ёсць магчымасць узяць добрыя творы. Не «з тэкстамі», як цяпер кажуць, а з сапраўднымі вершамі і музыкай, напісаныя прафесійнымі кампазітарамі, як наш Ігар Лучанок — у яго што не песня, то палатно, з якім трэба сур'ёзна працаваць. Я не думаю, што ў эстрадзе жыццё ў спевакоў прасцейшае, вядома, калі мы маем на ўвазе якасць, а не тых, хто выкарыстоўвае фанаграму. Я з павагай стаўлюся да сур'ёзных эстрадных спевакоў, ёсць вялікая колькасць прыкладаў, калі яны «бралі» залы, краналі чалавека за душу, а гэта дарагога варта.

Я выконваю добрыя песні з задавальненнем, але прысвяціць сябе гэтаму наўрад ці гатовы. Таму што калі спектакль ідзе цяжкі, як правіла, потны, з разбітымі каленамі, але потым выходзіш на паклон і адчуваеш, як зала выдыхае і за хвіліны апладысментаў аддае табе ўсё, што ты ўклаў у дзве гадзіны, — гэта нічым не замяніць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Банк торговый капитал
Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

**www.tcbank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 30 сентября 2023 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2023 | 01.01.2023 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3 545 | 1 912 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 519 | 6 244 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 135 530 | 128 165 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 10 918 | 16 361 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 21 527 | 16 351 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 31 313 | 31 313 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3 737 | 3 623 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 312 | 393 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 14 | 17 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 19 140 | 19 670 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 227 555 | 224 049 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 4 150 | 4 121 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 12 387 | 15 642 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 193 | 171 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 16 730 | 19 934 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 61 651 | 61 651 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 17 | 17 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 23 000 | 22 000 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 2 111 | 2 273 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 124 046 | 118 174 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 210 825 | 204 115 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 227 555 | 224 049 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ 30 сентября 2023 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.09.2023 | 30.09.2022 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 11 048 | 15 755 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 55 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10 993 | 15 755 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 558 | 96 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 202 | 67 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 356 | 29 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (40) | (580) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 496 | 2 216 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 324 | (289) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 297 | 94 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 903 | 4 435 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | - | - |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 6 875 | 13 368 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 4 | 761 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 6 871 | 12 607 |

Заместитель Председателя Правления Фаррохи Х.М.

Главный бухгалтер Тиванова Н.А.

Дата подписания: 02 октября 2023 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 14.04.2023, БИК 153001333, УНП 807000163.

## Могилевский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении у «Белгосстраха»

Аукцион состоится **24.10.2023 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352
(офис Могилевского филиала
РУП «Институт недвижимости и оценки»)

**ЛОТ № 1: ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ с инвентарным номером 721/D-655 – АДМИНИСТРАТИВНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ, площадь 67,2 кв. м, назначение – административное помещение.**

Адрес:
Могилевская обл., Дрибинский р-н, г. п. Дрибин, ул. Зеленая, 5-7.

**Металлические конструкции на окна (инв. № 302). Пожарное оборудование для охраны в отделе Дрибин (инв. № 261). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.**

**Начальная цена продажи: 27 849,80 бел. рублей с учетом НДС 20 % в размере 72,14 бел. рублей.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь и на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте **ino.by**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о третьих повторных открытых торгах в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Вестерн хорс»

(УНП 193425364, Минская область, Логойский район, с/с Острошицкий, д. Чуденичи, д. 2, пом. 4 (административное)).

***Дата и время проведения торгов*: 18 октября 2023 года.**
Начало – 12.00. Заявки принимаются с 07 октября 2023 года по 16 октября 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **ООО «Вестерн хорс» (УНП 193425364)** в лице ликвидатора – директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» А.А. Колыско.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лотов в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 125 (30005) за 01.07.2023. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 156 (30036) за 15.08.2023. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 166 (30046) за 29.08.2023

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ И ПРЕДМЕТЕ АУКЦИОНА

УНП 100104937

**Организатор аукциона:** комитет «Минскоблимущество», тел.: (8017) 5004710, 5168054, 5168055.
Дата и время проведения повторного аукциона:
**25 октября 2023 г. в 11.00**

**Жилое помещение: изолированное помещение** (инв. № 601/D-8552) – **КВАРТИРА В БЛОКИРОВАННОМ ЖИЛОМ ДОМЕ,**
общ. пл. 93,7 кв. м (жилая площадь – 54,0 кв. м), 1990 г. п., расположенное по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Жабичи, ул. Солнечная, 1-2.
**Начальная цена предмета аукциона: 38 815,12 руб**.
*(Начальная цена понижена на 50 %).*
Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction/).

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «Вороновская сельхозтехника», Гродненская обл., Вороновский р-н, д. Бояры |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом**
Месторасположение: Гродненская область, д. Бояры

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Грузовая платформа тентовая GAZ-331043**, рег. знак АА 4459-4, 2007 г. в., инв. № 789 | **8 870,30** |
| 2 | **Микроавтобус-вагон GAZ-32213**, рег. знак АА 4460-4, 2007 г. в., инв. № 797 | **5 068,75** |
| 3 | **Грузовой специальный самосвал MAZ 555142 4227**, рег. знак АЕ 1571-4, 2006 г. в., инв. № 763 | **9 820,69** |
| 4 | **Грузовая специальная цистерна GAZ–5312 -01-3613**, рег. знак СН3345, 1988 г. в., инв. № 743 | **6 335,93** |
| 5 | **Грузовой самосвал ЗИЛ 495850**, рег. знак СН3346, 1989 г. в., инв. № 231 | **50 68,75** |
| 6 | **Грузовой самосвал КАМАЗ 55102**, рег. знак СА7626, 1987 г. в., инв. № 17 011 | **10 771,07** |
| 7 | **Легковой специальный хэтчбек VAZ-21140 22**, рег. знак 8829 АР-4, 2005 г. в., инв. № 742 | **1 710,70** |
| | Цена по лотам №№ 1–7 снижена на 10 % | |
| 8 | **Легковой седан VOLKSWAGEN PASSAT**, рег. знак 4900 ЕВ-4, 2008 г. в., инв. № 845 | **7 391,92** |
| 9 | **Грузовой бортовой GAZ-53 А**, рег. знак СН3348, 1989 г. в., инв. № 245 | **2 463,97** |
| 10 | **Грузовая специальная цистерна ГАЗ 52 М 3607**, рег. знак СН0891, 1990 г. в., инв. № 17 355 | **2 358,37** |

С подробной информацией по предмету торгов можно ознакомиться на сайте организатора торгов **www.cpo.by**.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **8 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.08.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 19.10.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.10.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны:**
**+375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

## БЛОНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**24 октября 2023 года** проводит **ПОВТОРНО аукционные торги** по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома с расположенным на нем не завершенным незаконсервированным капитальным строением гражданам Республики Беларусь, расположенных на территории Блонского сельского Совета Пуховичского района Минской области

| № лота | Адрес земельного участка с расположенным на нем незавершенным незаконсервированным капитальным строением | Площадь (га) | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (рублей) | Затраты | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Блонь, ул. Солнечная, 23Б** Кадастровый номер: 624480801601000942, Объем (площадь) строения 465 куб. м (кв. м), готовность строения 12 %, фундамент – бетон | 0,2276 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 17 903,31 | 2 391,87 + публикация в сми | 1790,33 |
| 1 | **д. Заречье, ул. Вишневая, 15** Кадастровый номер: 624480801601000516, Объем (площадь) строения 384 куб. м (кв. м), готовность строения 12 %, фундамент – бетон | 0,1020 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 9 913,02 | 1929,42 + публикация в сми | 991,30 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, гражданином – документ, содержащий его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования, представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Аукцион состоится **24 октября 2023** года **в 11.00** по адресу: аг. Блонь Пуховичского района Минской области, ул. Садовая, д. 4А.

Задаток перечисляется на р/с BY13AKBB36006250200050000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600177637, ОКПО 04430996, код платежа 04901 в срок до **20 октября 2023 г.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **20 октября 2023 г** включительно до 17.30 по вышеуказанному адресу. Контактные телефоны: (801713) 5-60-51, 4-44-55, 4-46-46.

Сайты Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Пуховичского районного исполнительного комитета.

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры по земельным участкам подлежат возмещению в установленном законодательством порядке.

# БУЛЬБЯНЫЯ ІМПЕРЫІ: ЯК «ЗЕМЛЯНЫ ЯБЛЫК» ЗАВАЁЎВАЎ СВЕТ

## Наколькі карысны караняплод, і як часта яго можна есці?

**У Беларусі бульба — культавы прадукт. Яго называюць другім хлебам. Многія ядуць стравы з яе ледзь не кожны дзень. Яе гатуюць усімі магчымымі спосабамі: вараць, пякуць, смажаць і змешваюць з іншымі прадуктамі. Пры гэтым часта людзі памятаюць толькі пра карысць, лічачы, што караняплод і здольны добра насыціць арганізм, і спрыяе атрыманню патрэбнай дозы вітамінаў. Аднак шкода ад лішку бульбы таксама ёсць. У свой час бульба ўмацоўвала імперыі і выратоўвала ад голаду. Сёння пра яе ходзяць супярэчлівыя чуткі. То яе называюць ледзь ці не адным з самых карысных прадуктаў, а потым раптам караняплод трапляе ў нямілась і яго раяць выключыць з рацыёну. У чым карысць і шкода бульбы, расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ Гумен ГАРБАННІДЖАД.**

***— Некаторыя даследчыкі падзяляюць імперыі на пшанічныя і бульбяныя. Адкуль яно пайшло?***

— Гісторыку, аўтару кнігі «Узыходжанне Захаду» Уільяму Макнілу належыць выказванне: «Калі б не было бульбы, Еўропа не змагла б дасягнуць таго поспеху, які мае цяпер». І з гэтым цяжка не пагадзіцца.

Голад у перыяд сярэдневякоўя ў Еўропе лічыўся звычайнай рэччу, і шмат людзей з гэтай прычыны гінула. Многае залежыла ад таго, ураджайны год ці неўраджайны, ішлі дажджы ці была засуха, хварэлі расліны і ці не загубілі іх шкоднікі. Зямель для вырошчвання пшаніцы было мала, бо гэта дастаткова капрызная культура. Такім чынам, ураджай залежаў ад многіх фактараў.

Калі чалавеку не хапае калорый, з раніцы да вечара ў яго думкі толькі пра тое, што з'есці, каб не памерці ад голаду. А не пра адкрыцці ці пашырэнне сваёй тэрыторыі. Недахоп ежы моцна ўплывае на ход думак.

Адзінае месца, дзе праблема голаду была не такой актуальнай, — тэрыторыя вакол Міжземнага мора: у вадзе шмат і морапрадуктаў, можна атрымліваць ураджай раслінаай ежы, у тым ліку вырошчваць пшаніцу. Гэтыя тэрыторыі развіваліся. Таму Рымскую імперыю, Егіпет і Персію называлі «пшанічнымі імперыямі», іх моц палягала ў тым, што яны маглі вырошчваць зерне і развівацца.

Дарэчы, на тэрыторыях з дастаткам бялковай ежы людзі былі больш агрэсіўныя і больш імкліва развівалі свае імперыі, напрыклад, вікінгі. У іх быў свабодны доступ да мора, а значыць, шмат рыбы, а гэта крыніца бялку, і яны лічыліся моцнымі воінамі.

У Індыі і Кітаі пераважна ўжывалі рыс, бо глеба і надвор'е спрыялі яго вырошчванню. Але зноў жа і там быў вядомы голад: то адсутнасць вады, то хваробы раслін перыядычна станавіліся прычынамі неўраджаю. А паколькі канцэнтрацыя насельніцтва была дастаткова вялікай, галодныя гады і тут прыносілі вялікую колькасць ахвяр.

Карэнным чынам сітуацыю змяніла адкрыццё Каламбам Амерыкі ў 1492 годзе. Іспанцы былі ўражаны, што мясцовыя жыхары, індзейцы, нягледзячы на тое што не моцна развітыя, вельмі прасунутыя ў раслінаводстве. Там упершыню яны ўбачылі фасолю, какава-бабы, салодкі перац, памідор, гарбуз, кабачок і, самае галоўнае, кукурузу і бульбу.

Індзейцы выкарыстоўвалі змешаную форму вырошчвання. Саджалі кукурузу, паміж ёй, дзе быў цень, вырошчвалі фасолю, бо яна не любіць сонца, да таго ж фасоля не давала расці пустазеллю. Там жа вырошчвалі кабачок і гарбузы. Адначасова яны збіралі ўраджай кукурузы, фасолі, кабачкоў і гарбузоў і, такім чынам, атрымлівалі максімум карысці ад глебы.

Іспанцы хутка зразумелі, што бульба, у адрозненне ад пшаніцы, не надта залежыць ад умоў надвор'я, бо расце пад зямлёй. З дзікіх сартоў індзейцы цягам тысячагоддзяў выводзілі больш устойлівыя. Нягледзячы на тое, што радзімай караняплоду з'яўляюцца Анды — горныя раёны Балівіі і Перу, бульба на тэрыторыі тагачаснай Амерыкі расла ўсюды — з Поўначы да Поўдня, але адрознівалася формай і колерам. Гэтак жа і кукуруза. Еўрапейцы зразумелі, што гэта культуры, якія можна вырошчваць у розных шыротах з розным кліматам.

У Еўропу бульбу іспанскія канкістадоры завезлі ў 1570 годзе з Паўднёвай Амерыкі. Яна спачатку была прынята за дэкаратыўную расліну, прычым атрутную. Але з часам стала зразумела, што гэта выратаванне ад голаду. Бо бульба, вырашчаная на ўчастку памерам з футбольнае поле, дае ўраджай у 7,5 мільёна калорый, а пшаніца на такой жа тэрыторыі —толькі 3,8 мільёна, амаль удвая менш. Таму нямецкую, аглійскую, французскую і расійскую імперыі называюць імперыямі бульбы.

Першае з'яўленне бульбы ў Расіі адносіцца да канца XVII стагоддзя і звязана з імем Пятра I. Спачатку бульба лічылася экзатычнай раслінай і падавалася на стол толькі ў арыстакратычных дамах. З-за мноства атручванняў, выкліканых ужываннем у ежу пладоў і маладых клубняў, якія змяшчаюць саланін, сяляне спачатку не прынялі новую культуру. Вядомы нават бульбяныя бунты ў Расійскай імперыі — масавыя выступленні сялян, звязаныя з прымусам да вырошчвання бульбы і з няведаннем правілаў яе захоўвання і ўжывання, што выклікала атручванні. Але паступова бульба атрымала прызнанне, выцесніўшы з сялянскага рацыёну рэпу. Тым не менш яшчэ ў XIX стагоддзі многія сяляне называлі бульбу «чортавым яблыкам» і лічылі грахом ужыванне яе ў ежу.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі, а тады Рэчы Паспалітай, бульба з'явілася ў 1676 годзе, калі яе прывезлі з Еўропы. Аднак пасадкі бульбы тады былі абмежаваныя, яе плады лічыліся далікатэсам і падаваліся толькі ў багатых дамах Варшавы і Вільні. У XVIII стагоддзі бульбу сталі вырошчваць і спажываць ужо амаль па ўсёй Беларусі. Пасля ўваходжання ў склад Расійскай імперыі на землях сучаснай Беларусі працягвалі вырошчваць бульбу. Гэтаму спрыялі і самі землі, асабліва тарфянікі.

Гісторыкі лічаць, што Расія пашырала свае ўладанні дзякуючы бульбе. Нягледзячы на тое што ў Індыі і Кітаі асноўнай ежай быў рыс, калі туды прыйшла бульба, яна выратоўвала ад голаду. І сёння гэтыя краіны разам з Расіяй з'яўляюцца лідарамі ў свеце па вырошчванні бульбы.

***— У чым жа яе карысць?***

— Гэта, натуральна, не супердуд. Аднак бульба ўтрымлівае вялікую колькасць некаторых мінералаў, у прыватнасці калію. Гэта мінеральнае рэчыва робіць свой унёсак у барацьбу з гіпертаніяй дзякуючы таму, што спрыяе пашырэнню сасудаў. Калій таксама валодае мачагоннай уласцівасцю і неабходны людзям, якія пакутуюць на падагру, ацыдоз, цыстыт і прастатыт. Жалеза, фосфар, кальцый, магній і цынк, якія змяшчаюцца ў бульбе, дапамагаюць росту і ўмацаванню касцей. Таксама бульба ўтрымлівае вітаміны С і групы В. Бялкі, якія таксама ўтрымліваюцца ў бульбе, забяспечваюць арганізм чатырнаццаццю з дваццаці неабходных амінакіслот. Такім чынам, дзякуючы бульбе можна забяспечыць сябе пэўнай колькасцю мінералаў і вітамінаў. Калі ў чалавека няма атлусцення, цукровага дыябету, праблем са скурай, можна смела яе ўжываць раз-два на тыдзень.

***— Беларусы ўжываюць бульбу нашмат часцей. Гэта шкодна?***

— Карысці ад такога монахарчавання няшмат. Бульбу можна есці кожны дзень, калі яна не складае аснову рацыёну. Напрыклад, калі служыць адным з кампанентаў супу. Улічваючы яе высокі глікемічны індэкс (велічыня, якая вызначае цукровапавышальныя ўласцівасці прадукту), лічыцца дастатковым есці бульбу кожны дзень цягам тыдня, каб набраць кілаграм вагі. Глікемічны індэкс вымяраецца па шкале ад 0 да 100, і ўсё, што болей за 70 адзінак, лічыцца высокім. Дык вось у бульбы, у якім выглядзе яе ні ўжываць, ён 70 і вышэй, прычым самы высокі — у смажанай.

Пры гэтым ёсць простыя прыёмы, якія дазваляюць зменшыць глікемічны індэкс у бульбы. Калі пасля прыгатавання яе астудзіць і патрымаць у халадзільніку, крухмал пераўтвараецца ў рэзістэнтны. Ён праходзіць праз страўнік і марудна ўсмоктваецца ў кішэчніку, з'яўляючыся добрай крыніцай харчавання для тамтэйшай мікрафлоры. А яна, як вядома, выконвае шмат функцый: уплывае на імунітэт, галаўны мозг, абмен рэчываў, адчувальнасць да інсуліну, узровень дрэннага халестэрыну, змяншае імавернасць анкалагічных захворванняў і многае іншае. На 100 грамаў ахалоджанай бульбы прыпадае 4 грамы рэзістэнтнага крухмалу (на кожную тысячу кілакалорый нам патрэбна 15 грамаў клятчаткі ці рэзістэнтнага крухмалу). Такі прыём, дарэчы, можна выкарыстоўваць для рысу і макароны.

Пра тое, што крухмал стаў рэзістэнтным, гаворыць змяненні бульбы. Яна становіцца менш смачнай і не такой рассыпістай, а больш шчыльнай, нават крыху падобнай на гуму. Але так яна больш карысная. Дарэчы, па гэтай жа прычыне больш шкодныя рассыпістыя сарты бульбы, чым шчыльныя, — крухмалу ў іх больш, і ён лягчэй засвойваецца.

***— З гэтай прычыны, ці можна бульбу паўторна разаграваць?***

— Рэзістэнтны крухмал пры гэтым застаецца, але яго колькасць нязначна змяншаецца. Калі на 100 грамаў ахалоджанай бульбы прыходзілася 4 грамы рэзістэнтнага крухмалу, то ў разагрэтым — каля 3,5 грама.

З гэтай прычыны карысны і бульбяны крухмал. Адна сталовая лыжка ўтрымлівае ад 7 да 9 грамаў рэзістэнтнага крухмалу. Калі дзве сталовыя лыжкі цягам дня дадаць у салату, ёгурт, гэта вялікая карысць для кішэчнай флоры. Рэзістэнтны крухмал ператраўліваецца ў кішэчніку не адразу, у адрозненне, напрыклад, ад гароху ці чачавіцы, і не выклікае павышанага газаўтварэння.

***— Нельга гатаваць зеленаватыя клубні. Чаму?***

— Бульба ўтрымлівае яд — саланін і іншыя глікаалкалоіды, але ў невялікай бяспечнай для нас колькасці. Але яна расце пры няправільным захоўванні, караняплоды пры гэтым становяцца зеленаватага колеру. Саланін назапашваецца пад лупінай. Таму пазелянелую бульбіну лепш выкінуць. Лічыцца, што для атручвання саланінам дастаткова паўкілаграма зялёнай бульбы.

Дзецям саланін увогуле супрацьпаказаны, бо ён найперш уплывае на нервовую сістэму. Некаторыя вучоныя лічаць, што вялікае назапашванне саланіну выклікае ў дзяцей зніжэнне інтэлекту.

Саланін не водараствральны, і дрэнна выводзіцца праз ныркі, а назапашваецца ў арганізме, у прыватнасці ў суставах. І можа выклікаць, акрамя неўралагічных, хваробы суставаў. Улічваючы, што ў Беларусі вільготнае надвор'е, мала сонца, а значыць, не самы спрыяльны для апорна-рухальнага апарату клімат, лішак саланіну для суставаў шкодны.

Саланін у бульбе разбураецца пры 170 градусах. Але калі падымаецца вышэй, то пачынаюць утварацца іншыя ядавітыя рэчывы, таму выдаляць яго такім чынам немэтазгодна.

Зялёныя памідоры, дарэчы, таксама ўтрымліваюць саланін. Калі яны спеюць, саланін змяншаецца да бяспечнага мінімуму.

***— У якім выглядзе бульба найбольш карысная?***

— Запечаная ў мундзіры. А самая шкодная — смажаная. Аднак якім бы карысным ні быў той ці іншы прадукт, здаровае харчаванне падразумявае разнастайны рацыён, бо так мы атрымліваем карысныя рэчывы з розных крыніц. І чым рацыён больш разнастайны, тым лепш.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПЕРШЫ ПРЫЗ ПАЕХАЎ У ГОМЕЛЬ

**Па выніках XXVI Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі РУП «Белпошта» ў камандным заліку пераможцам прызнана каманда Гомельскага філіяла РУП «Белпошта».**

На працягу трох конкурсных дзён 42 паштовыя работнікі — начальнікі і намеснікі начальнікаў аб'ектаў паштовай сувязі — дэманстравалі свае прафесійныя навыкі і спаборнічалі за званне найлепшага спецыяліста ў сваёй галіне.

1 месца сярод начальнікаў аб'ектаў паштовай сувязі заняла Марына Сяргееўна Мяжэйнікава, начальнік аддзялення паштовай сувязі № 1 г. п. Зяброўка Гомельскага філіяла;

2 месца — Марына Уладзіміраўна Кісляк, начальнік аддзялення паштовай сувязі № 9 г. Слоніма Гродзенскага філіяла;

3 месца заняла Юлія Ігараўна Вайцяхоўская, начальнік аддзялення паштовай сувязі № 15 г. Полацка Віцебскага філіяла.

1 месца сярод намеснікаў начальнікаў аб'ектаў паштовай сувязі заняла Ірына Мікалаеўна Нікіціна, намеснік начальніка аддзялення паштовай сувязі № 3 г. Мінска вытворчасці «Мінская пошта»;

2 месца заняла Людміла Юр'еўна Забалоцкая, намеснік начальніка аддзялення паштовай сувязі Краснасельскі Ваўкавыскага РВПС Гродзенскага філіяла;

3 месца заняла Валянціна Уладзіленаўна Махлянкіна, намеснік начальніка аддзялення паштовай сувязі № 47 г. Гомеля.

Па выніках Рэспубліканскага конкурсу і рашэнні журы на вышэйшую прыступку п'едэстала ў камандным заліку ў выніку найбольшай колькасці балаў пасля тэарэтычных і практычных выпрабаванняў узнялася каманда Гомельскага філіяла РУП «Белпошта»; другое месца заняла каманда вытворчасці «Мінская пошта»; трэцяе месца — у каманды Віцебскага філіяла РУП «Белпошта».

Грамата «За прафесіяналізм, імкненне да пастаяннага развіцця і дасягненне найвышэйшых вынікаў працы» ўручана Аліне Вітальеўне Мельнікавай, начальніку аддзялення паштовай сувязі Вейна Магілёўскага філіяла.

Грамата «За прафесійнае майстэрства і адданасць прафесіі» ўручана Алене Пятроўне Леўчанцы, намесніку начальніка АПС №17 г. Віцебска.

Грамата «За рэфармацарскія ідэі і дзелавую кампетэнтнасць» уручана Галіне Мікалаеўне Братухінай, намесніку начальніка АПС № 22 г. Магілёва.

Граматай «За прафесіяналізм, кампетэнтнасць і асабісты ўклад у вынікі каманды» адзначана Марыя Аляксандраўна Мазан, начальнік аддзялення паштовай сувязі № 19 г. Гродна, якая набрала найбольшую агульную колькасць балаў і вывела каманду Гродзенскага філіяла на 4 месца.

Фота з архіва РУП «Белпошта».

Граматай «За прафесіяналізм, кампетэнтнасць і асабісты ўклад у вынікі каманды» адзначана Віктарыя Аляксандраўна Навумчык, начальнік аддзялення паштовай сувязі № 9 г. Баранавічы, якая набрала найбольшую агульную колькасць балаў і вывела каманду Брэсцкага філіяла на 5 месца.

Граматай «За прафесіяналізм, кампетэнтнасць і асабісты ўклад у вынікі каманды» адзначана Вольга Міхайлаўна Правілава, начальнік АПС № 1 г. Жодзіна Барысаўскага РВПС, якая набрала найбольшую агульную колькасць балаў і вывела каманду Мінскага філіяла на 6 месца.

Грамата «Самаму камунікабельнаму і чароўнаму прафесіяналу» ўручана Вользе Анатольеўне Біхуновай, намесніку начальніка АПС № 6 г. Наваполацка Полацкага РВПС.

Грамата «За высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі каманды да XXVI Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства» ўручана Марыне Антонаўне Перагудзе, намесніку дырэктара Гомельскага абласнога філіяла РУП «Белпошта».

Аналагічная грамата ўручана Жанне Іванаўне Тарасенцы, начальніку аддзела эксплуатацыі паштовай сувязі і распаўсюджвання друку Гомельскага філіяла.

Грамата «За сістэмны і творчы падыход пры падрыхтоўцы каманды да XXVI Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства» ўручана Наталлі Валер'еўне Козыравай, намесніку начальніка вытворчасці «Мінская пошта».

Грамата «За ініцыятыву, стараннасць, прафесіяналізм, праяўленыя пры падрыхтоўцы каманды да XXVI Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства», уручана Кацярыне Рыгораўне Зінкевіч, намесніку дырэктара Віцебскага філіяла.

«Белпошта» аб'явіла ў сацыяльных сетках галасаванне па вызначэнні каманды ў намінацыі «Прыз сімпатый гледачоў». Пераможцам стала каманда Брэсцкага філіяла.

Конкурсы прафесійнага майстэрства праводзяцца пры актыўным удзеле прафсаюзнага камітэта, і XXVI Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства працаўнікоў аб'ектаў паштовай сувязі не выключэнне.

Са словамі віншаванняў і падзякі да ўдзельнікаў звярнулася намеснік старшыні журы, старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі РУП «Белпошта» Анжаліка Дробава.

Яна таксама ўручыла ўзнагароды:

Дыплом у намінацыі «За адданасць выбранай прафесіі» ўручаны Наталлі Леаніданўне Кулакоўскай, начальніку аддзялення паштовай сувязі № 3 г. Слуцка Мінскага філіяла;

Дыплом у намінацыі «За ўменне згуртаваць каманду» ўручаны Галіне Адамаўне Марчанцы, намесніку дырэктара Магілёўскага філіяла;

Дыплом у намінацыі «За імкненне быць найлепшым у выбранай прафесіі» ўручаны Дануце Іосіфаўне Саўрас, начальніку аддзялення паштовай сувязі № 1 г. Дзятлава Лідскага РВПС Гродзенскага філіяла;

Дыплом у намінацыі «За імкненне да самаразвіцця і дасканаласці ў выбранай прафесіі» ўручаны Кацярыне Антонаўне Ляшковай, начальніку аддзялення паштовай сувязі нумар 62 г.Мінска вытворчасці «Мінская пошта»;

Дыплом у намінацыі «За індывідуальнасць» уручаны Вользе Анатольеўне Стрэльчык, намесніку начальніка аддзялення паштовай сувязі № 9 г. Баранавічы Брэсцкага філіяла;

Дыплом у намінацыі «За крэатыўнае мысленне і творчы падыход» уручаны Юліі Мікалаеўне Дашкевіч, намесніку начальніка аддзялення паштовай сувязі № 3 г. Калінкавічы Гомельскага філіяла;

Дыплом у намінацыі «За адданасць справе і актыўную жыццёвую пазіцыю» ўручаны Алене Пятроўне Леўчанцы, намесніку начальніка аддзялення паштовай сувязі № 17 г. Віцебска.

Адзначаны дыпломам «За сардэчны прыём на базе адпачынку «Дружба» Аляксандр Віктаравіч Аношка.

Свята паштовага майстэрства завяршылася музычнай кампазіцыяй у выкананні Івана Кавалеўскага і агульным фота на памяць.

# СПРАВА ПА ДУШЫ

**Адным з удзельнікаў святочнага мерапрыемства «Скарынаўскія чытанні», якое адбылося ў старажытным Полацку, была спецыяліст па паштовай дзейнасці АПС № 14 г. Полацк Вера Якаўлева. З яе дапамогай кожны ахвотны мог аформіць падпіску на рэспубліканскія газеты і часопісы. Ветлівая і ўсмешлівая, яна з задавальненнем выконвала свае службовыя абавязкі, і жыхары Полацка часта звярталіся да яе.**

Фота Сяргея РУЧАНАВА.

— Па адукацыі я эканаміст, — адзначыла Вера ў размове. — На пошту прыйшла пасля заканчэння Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай. Адразу, калі ўбачыла аб'яву аб запрашэнні працаваць на пошце. Справа ў тым, што з дзяцінства мне вельмі падабалася збіраць і разглядаць паштоўкі і паштовыя маркі. Вось так маё дзіцячае захапленне адыграла галоўную ролю пры выбары будучай прафесіі. І я ўдзячная лёсу, што спыніла выбар менавіта на гэтай працы.

У паштовым аддзяленні Веры Якаўлевай прапанавалі пасаду аператара. Па словах дзяўчыны, яна адразу настроілася на сур'ёзную і добрасумленную працу. Зарэкамендавала сябе добра і праз паўгода стала спецыялістам па паштовай дзейнасці. Прызнаецца, што ў пачатку працоўнага шляху трэба было засвойваць шмат новай інфармацыі, але з часам усё стала на свае месцы. Настаўнікам стала кваліфікаваны і вопытны спецыяліст па паштовай дзейнасці Алена Варанчонак. З яе дапамогай спецыяльнасць была асвоена хутка. Яшчэ Вера дадала, што ў калектыве паштовага аддзялення, куды яна прыйшла працаваць, дзяўчыну сустрэлі прыязна. А апошнім часам ёй даверылі замяняць начальніка аддзялення.

— Сёння ў працэссе працы я выдаю і прымаю пасылкі, афармляю плацяжы, узаемадзейнічаю з мясцовымі філатэлістамі. Таксама прыемна ўдзельнічаць у спартыўных спаборніцтвах, якія праводзяцца сярод паштавікоў. Мару паступіць у Акадэмію сувязі, а таксама прыняць удзел у конкурсе прафесійнага майстэрства. На пошце мне працуецца лёгка, я не дарма вырашыла звязаць жыццё з сувяззю. Прыемна, што і людзі ставяцца да мяне добра, — з усмешкай паведаміла суразмоўніца.

# КІРОЎЦА І ПАШТАЛЬЁН У АДНОЙ АСОБЕ

**Пачынаючы з мая, паштальён Кіраўскага УПС Ірына Мурашка аказалася ў новай ролі. Замест пасады звычайнага паштальёна ёй прапанавалі першай у калектыве паспрабаваць свае сілы ў якасці паштальёна-кіроўцы. Доўга не разважаючы, Ірына Пракопаўна згадзілася. І вось, пачынаючы з мая, яна дастаўляе карэспандэнцыю, пасылкі і спажывецкія тавары ў вёскі раёна самастойна.**

— Справа ў тым, — сцвярджае Ірына Пракопаўна, — што кіраваць аўтамабілем — адзін з маіх любімых заняткаў. Пасведчанне кіроўцы я атрымала некалькі гадоў таму, на сямейным аўтамабіле езджу і па раёне, і ў суседні Бабруйск. Таму, калі мне прапанавалі пасаду кіроўцы-паштальёна, я нават узрадавалася. Цікава, што мой муж падобнае рашэнне падтрымаў. Так у маім распараджэнні апынуўся аўтамабіль «Рэно Докер», на якім я сёння наведваю вёскі, куды раней мяне вазіў штатны кіроўца УПСа.

На пошце Ірына Мурашка працуе ўжо восем гадоў. Да гэтага працавала ў гандлі. За гэты час добра азнаёмілася са сваім падведамасным участкам і людзьмі, якія там пражываюць. Гэта ёй добра дапамагае сёння, калі рыхтуецца да маршруту. Ну, а ў астатнім абавязкі засталіся ранейшыя: прыём і дастаўка карэспандэнцыі, дастаўка перыядычнага друку, выдача пенсій, прыём камунальных плацяжоў, дастаўка спажывецкіх тавараў. Сур'ёзна дапамагае ў рабоце апаратна-праграмны комплекс «мабільны паштальён». У Ірыны Пракопаўны сёння адразу не дзве, а тры спецыяльнасці: паштальён, кіроўца і аператар. І з усімі яна паспяхова спраўляецца.

— Нельга сказаць, што мне ўсё давалася лёгка, — працягвае суразмоўніца. — У першыя тыдні, калі сама села за руль паштовага аўтамабіля, вельмі стамлялася. Але потым уцягнулася. Дапамагае тое, што добра ведаю раён. Кожную паездку абавязкова распланоўваю. Своечасовая дастаўка ў першую чаргу залежыць ад стану дарогі, і гэта неабходна ўлічваць. Бо людзі мяне чакаюць. З вяскоўцамі ў мяне за доўгі час працы склаліся добрыя зносіны. Яны, у першую чаргу пажылыя людзі, часта мне тэлефануюць, просяць прывезці

Фота з архіва Кіраўскага УПС.

пэўныя спажывецкія тавары і прадукты харчавання, на што я не магу не адгукнуцца.

Сказаць, што вяскоўцы здзівіліся, убачыўшы мяне за рулём, — нічога не сказаць. Трэба было бачыць іх здзіўленыя твары. А першым пытаннем у адной з вёсак было такое: куды ж ты кіроўцу падзела? На што адказала ім, што цяпер кіроўца я. Дзякуй людзям, што спачуваюць мне. Многія, асабліва жанчыны, часта пытаюцца: як ты, бедная, з усім гэтым спраўляешся?

Адказваю, што спраўляюся добра, што такая праца мне падабаецца і я задаволена, што выбрала падобную спецыялізацыю. Дадам, што калектыў нашага УПС вельмі дружны. У ім адчуваеш сябе як у сапраўднай сям'і. Буду і далей працаваць у цяперашнім амплуа. Дарэчы, хутка акрамя мяне ў нашам калектыве з'явіцца яшчэ адзін кіроўца-паштальён. І гэта таксама будзе жанчына. Хочацца пажадаць ёй поспехаў на гэтым незвычайным шляху!

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей РУЧАНАЎ.**

# МОЦНАЯ МОДА

## Абнаўляем мужчынскі гардэроб да восені

**Шлях да стыльнага гардэроба для мужчын у нашай краіне значна складанейшы, чым для жанчын. Па традыцыі большасць айчынных вытворцаў арыентавана на прыгожую палову — гэта канстатуюць і пакупнікі, і спецыялісты прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, і нават кіраўніцтва галіны. Пакуль што беларускія кампаніі прапануюць мужчынам у асноўным дзелавыя касцюмы і класічныя кашулі. Прадстаўлены таксама спартыўны стыль (тыя ж худзі і іншы трыкатаж для мужчын ствараюць «Світанак», «Марк Фармэль», «Контэ Спа», яшчэ шэраг марак). Ну, а калі душа просіць нечага іншага? Тады мужчынам застаюцца рэчавыя рынкі — адносна танная, але не занадта якасная кітайская, радзей турэцкая прадукцыя, а таксама дызайнерскія прасторы — крэатыўна, ярка, стыльна, дорага (бо дызайнерскае адзенне танным апрыёры не бывае). Але ўсё ж і ў беларускага легпрама, як ужо адзначалася, сёе-тое для мужчын можна знайсці заўсёды.**

### Зона камфорту

Што ж модна цяпер, і якім дызайнеры бачаць мужчыну гэтай восенню? Значная частка тэндэнцый у свеце menswear перавандравала ў гэтую восень з мінулай вясны. І нават з мінулай зімы. Гэта, напрыклад, карго — такія мешкаватыя «працоўныя» штаны са мноствам кішэняў. Выдатны выбар, дарэчы, калі на працы няма дрэс-кода. Таму што, з аднаго боку, такая мадэль — гэта зручна і практычна: тоўстая трывалая тканіна, шмат ёмістых кішэняў, а з другога — вы на грэбні модных хвалі.

Гэта, напрыклад, цяжкая «верхняя» кашуля — такія можна насіць замест курткі, а калі пахаладае, пад паліто або пухавік. Шыюцца яны з тоўстай тэкстураванай тканіны (шэрсць, вельвет, твід і нават прызабытая замша, якая сёння зноў набірае актуальнасць). Такая кашуля-куртка — укладанне «на стагоддзі». Гэтай восенню і нават зімой, цалкам магчыма, насіць яе вы будзеце штодня. Ну, а калі мода на такія кашулі пройдзе, яна зойме сваё законнае месца ў «дачным гардэробе», і вы будзеце ў ёй капаць градкі на ранішняй зорцы, сталярнічаць у цяньку або хадзіць на рыбалку ў вячэрнюю прахалоду яшчэ гадоў дзесяць...

Гэта, напрыклад, «паходныя» цяжкія чаравікі, якія ў восеньскім сезоне-2023 складаюць сур'ёзную канкурэнцыю больш класічнаму агульнапрынятаму варыянту — чэлсі. Як і чэлсі, такія чаравікі падыходзяць пад усё: джынсы і штаны, куртку і пухавік. Але тут ёсць удакладненне: для паўсядзённага нашэння яны павінны быць высакакласнымі (як, зрэшты, і для экстрыму, для якога першапачаткова прыдуманыя — і гэта скажа вам любы паходнік). Ну, а высакакласныя — значыць, дастаткова дарагія. І менавіта так яны мусяць выглядаць. Як японскі поўнапрывадны джып, які, нават запырсканы дарожным брудам, усё роўна выглядае выдатна. Адкінуўшы параўнанні, скажам, што такі абутак, калі вы не паскупіліся пры яго набыцці, праслужыць не адзін і не два гады і вам не страшныя ні галалёд, ні лужыны.

Як можна заўважыць, мужчынская і жаночая мода гэтай восенню ідуць поруч: дзяўчаты таксама актыўна носяць і карго, і кашулі-куркі, і грубыя чаравікі. Яшчэ адзін універсальны трэнд, актуальны і для жаночай, і для мужчынскай моднай восені — фактурны неструктураваны пінжак. Такі нядбайны, мешкаваты і які (ключавое слова — быццам бы) не трымае форму. Выбіраючы такі блэйзер, якраз вельмі важна звярнуць увагу на яго выключную якасць. Інакш выглядаць ён будзе не нязмушана і нефармальна, як задумвалася, а неахайна і неэстэтычна. Але калі наш «неструктураваны» пінжак добрай якасці — гэта значыць, пашыты па якасных лякалах з добрай тканіны (у ідэале — з воўны), то вы выглядаеце як трэба: з аднаго боку, досыць «прыстойна» (можна і на працу), з другога — крыху па-хуліганску. Меседж такі: вы прыклалі намаганні, каб выглядаць фармальна, але вашу свабодалюбівую асобу, моцны характар і ўпэўненасць у сабе не схаваць. Яшчэ адзін must have для мужчын гэтай восенню — правільнае ваўнянае паліто, якое падыдзе да любой нагоды і выручыць у любых сітуацыях: і пры стварэнні афіцыйнага, і больш вольнага вобраза. Мужчынскае паліто — наогул пазачасавы трэнд. У сярэдзіне васьмідзясятых творчыя маладыя людзі ездзілі на «таўкучку», каб купіць з рук некалі наменклатурнае, а на момант пакупкі пацёртае савецкае паліто шэра-чорнага або мышынага колеру, дрэнна, але надзейна пашытае ў 1970-х. Камбінаваць такое паліто належала не з касцюмам, а з джынсамі, напрыклад, або бясформеннымі штанамі-«бананамі» (іх шылі на машынцы саматужным спосабам), а насіць — наросхрыст. Такі look нёс у сабе пасыл абыякавасці да вонкавага ў процівагу багатаму ўнутранаму свету, і менавіта ён і быў тады трэндам (хоць слова такога ў той час ніхто не ведаў). Сёння, зразумела, фасоны паліто іншыя, колеры іншыя і зусім іншая якасць тканіны, але мужчынскае паліто па-ранейшаму застаецца асновай стыльнага вобраза і (пры правільным абыходжанні з ім) робіць свайго ўладальніка цікавейшым у вачах процілеглага полу.

### Што новага?

Ну, а зараз тэндэнцыі, якія не перавандравалі ў гэтую восень з мінулых сезонаў, а сталі адкрыццём у сезоне цяперашнім. Па-першае, мілітары-стыль, актуальны ўжо не першы год, гэтай восенню трансфармаваўся ў так званую «авіятарскую эстэтыку». На піку папулярнасці курткі-авіятары, пераемнікі ўжо разжалаваных з ультрамодных акцэнтаў у базавы гардэроб бомбераў. Гэта скураныя курткі з футравым аздабленнем — яно можа быць як кантрасным, так і ў адзіным колеры з астатнім вырабам. Стылісты раяць насіць такія курткі з цяжкімі чаравікамі (пра якія мы расказвалі вышэй) і худзі (капюшон замест шапкі — адсылка да авіятарскага шлема).

Яшчэ крыху пра верхняе адзенне. Дзяўчаты носяць курткі-касухі ўжо не першы і нават не другі сезон. Курткі гэтыя паспелі не раз трансфармавацца, змяніць і нюансы формы, і асаблівасці матэрыялу, і трэндавыя колеры, і даўжыню, і шырыню рукавоў: мода не прызнае меж. Але ў гэтым сезоне байкерская куртка трыумфальна вярнулася і ў мужчынскую моду. Насіць такія касухі стылісты рэкамендуюць мужчынам як з джынсамі, так і са скуранымі штанамі (у гэтым выпадку асабліва важна праявіць добры густ, таму што лёгка скаціцца ў безгустоўшчыну і кіч).

